Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 1 1933 г. ПЯТНІЦА № 193 (4737) Год выданьня XVII

КАМСАМОЛЬЦЫ, ПРАЦОЎНАЯ М[illegible] ЗГУРТУЕМСЯ ВАКОЛ ЛЕНІНСКАГА ЦК УсеКП(б) І ПРАВАДЫРА П[illegible]АСЬНІКА ЧАЙ КЛЯСЫ У[illegible] СЬВЕТУ

сацспаборніцтве з Заходняй вобласьцю

[illegible]то ў якія-небудзь 2-3 гады [illegible] якія карыстаюцца багацьцем (СТАЛІН)

Прывітаньне ЦК КП(б)Б Менскаму камсамолу

ЦК ВІТАЕ МЕНСКУЮ КАМСАМОЛЬСКУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ Ў АСОБЕ ПЛЕНУМУ ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ, ЯКІ САБРАЎСЯ НА ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ НАПЯРЭДАДНІ МІЖНАРОДНАГА ЮНАЦКАГА ДНЯ.

ЦК НЕ СУМНЯВАЕЦЦА, ШТО ВЫ, ВЕРНЫЯ ПАМОЧНІКІ ПАРТЫІ Ў СПРАВЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ПАБУДОВУ БЯСКЛЯСАВАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДЗТВА, БУДЗЕЦЕ ВЫСОКА ТРЫМАЦЬ У РУКАХ СЬЦЯГ ПРАЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ.

НЯЎХІЛЬНА СЬЛЕДУЮЧЫ ВУЧЭНЬНЮ ПРАВАДЫРОЎ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ МАРКСА, ЛЕНІНА, СТАЛІНА, ВЫ — ЗЬМЕНА НАШАЙ СЛАЎНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ПАВІННЫ Ў НЕПРЫМІРЫМАЙ БАРАЦЬБЕ З КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАКТЫЧНА ПЕРАТВАРЫЦЬ У ЖЫЦЬЦЁ ПРЫНЦЫПЫ МАРКСЫЗМУ-ЛЕНІНІЗМУ НА ЎСІХ ВУЧАСТКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

НЯХАЙ ЖЫВЕ БАЯВАЯ КАМСАМОЛІЯ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ XIX МЮД!

ЦК КП(б)Б.

XIX МЮД

Сёньня рэвалюцыйная моладзь усіх краін, усіх калёній і поўкалёній дэманструе сваю гатоўнасьць да новых рашаючых баёў за пралетарскую рэвалюцыю, супроць капіталізму і імпэрыялістычнай вайны, супроць фашызму і сацыял-фашызму.

Сёньня, у XIX МЮД, маладыя пралетары і маладыя працоўныя ўсяго сьвету яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады вакол Камінтэрну і Камуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі, за абарону сваёй бацькаўшчыны — СССР.

МЮД узьнік, як пратэст мільённых мас рэвалюцыйнай моладзі супроць імпэрыялістычнай вайны і атрутнай хвалі сацыял-фашызму, супроць здрадніцтва міжнароднай сацыял-дэмакратыі.

Толькі Ленін, толькі адны бальшавікі нястомна і непрымірна выкрывалі сапраўдную сутнасьць сусьветнай імпэрыялістычнай вайны. Тільки Ленін і яго партыя выкрывалі перад пралетарыі і працоўнымі ўсяго сьвету здраду сацыял-згодніцкаў, іх верную лёкайскую службу генэральным штабам імпэрыялістычных армій.

Міжнародны рэвалюцыйны юнацкі рух цесна, непарыўна зьвязан кроўнымі ніцямі з імем Леніна, з яго вучэньнем, з Камуністычным Інтэрнацыяналам. Уладзімер Ільліч Ленін прымаў непасрэдны ўдзел у кіраўніцтве міжнародным юнацкім рэвалюцыйным рухам, у стварэньні Камуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі, у барацьбе за яго бальшавізацыю. Як і раней, так і ў перыяд вайны, у перыяд адкрытага пераходу сацыял-дэмакратыі ў лягер буржуазіі, вакол Леніна і бальшавікоў яднаўся, гуртаваўся ўся рэвалюцыйная моладзь, яна ішла за ленінскім лёзунгам непрымірнай барацьбы супроць ашарытызму і шавінізму, за пралетарскі інтэрнацыяналізм.

Пралетарскі юнацкі рух — арганічная частка агульнага рабочага руху, і яго задачы кроўна зьвязаны з агульнымі задачамі рабочай клясы, з задачамі барацьбы за пралетарскую дыктатуру, за справу пралетарскай рэвалюцыі. Камуністычная юнацкая арганізацыя ня можа павесьці масы працоўнай моладзі на барацьбу за іх клясавыя інтарэсы, за зьвяржэньне буржуазіі, ня можа існаваць і працаваць без кіраўніцтва камуністычнай партыі — авангарду рабочай клясы.

«Кіраўніцтва партыі ёсьць самае галоўнае і самае асноўнае ва ўсёй рабоце камсамолу» (І. СТАЛІН).

Ленін, Сталін, партыя, Камуністычны Інтэрнацыянал, КІМ выхоўваюць пралетарскую і працоўную моладзь у духу клясавай барацьбы пралетарыяту супроць капіталізму.

Лёкаі буржуазіі — сацыял-фашысты супроць рэвалюцыйнага шляху юнацкага руху, яны імкнуцца падрыхтаваць з працоўнай моладзі паслухмянае гарматнае мяса.

XIX МЮД праходзіць ў асаблівай абстаноўцы. Дзьве сыстэмы, два сьветы стаяць адзін супроць другога.

СССР, перад якім, як перад непарушнай гранітнай скалой, спыніўся бушуючы жэвіш сусьветнага эканамічнага крызісу.

СССР, які стаў перадавой індустрыяльнай краінай і будуе бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

СССР, дзе мільёны пралетараў і працоўных на чале з партыяй Леніна—Сталіна няўхільна ўзьнімаюць свой матар'яльна-культурны ўзровень, дзе будуецца новае, заможнае калгаснае жыцьцё.

СССР — аплот міру, адзіны і пастомны змагар супроць імпэрыялістычных войнаў, гатовы ў любую мінуту абараніць сваё сацыялістычнае будаўніцтва.

І капіталізм, шаражоны тіганцкім эканамічным крызісам.

І капіталізм, які асуджае ўсё новыя і новыя масы рабочых і працоўных, у тым ліку працоўную моладзь, на голад, галечу, павольную сьмерць.

І капіталізм, які шалёна імкнецца знайсьці выхад з крызісу ў новых імпэрыялістычных войнах, у новых антысавецкіх інтэрвэнцыях, у апалелым фашысцкім тэроры.

Гітлераэм і Герынгам, фашысцкім вандалам XX стагодзьдзя і іх імпэрыялістычным гаспадаром не дапамогуць ні дзікі сярэднявяковы тэрор, ні ашуканчая дэмагогія, ні распальванне нацыянальнай варожасьці, ні ўжываньня сякеры, як зброі расправы над рэвалюцыйнымі змагарамі.

Падпольная гераічная КПГ і камсамол Германіі адважна і нястомна стаяць на сваім пасту. Камсамол Кітаю пад кіраўніцтвам кіткампартыі, кампартыя, камсамол Японіі мабілізуюць масы супроць гамідаваўскіх катаў і японскіх акупантаў.

У XIX МЮД па ўсім сьвеце пракоціцца магутная тіганцкая лавіна мюдаўскіх дэманстрацый пад сьцягамі гатоўнасьці да новых баёў за дыктатуру пралетарыяту супроць капіталізму, за абарону СССР, супроць імпэрыялістычнай вайны, за адзіны пралетарскі фронт пад сьцягам баявога пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Камсамол краіны Саветаў і ўся працоўная моладзь Савецкага саюзу адзначаць XIX МЮД яшчэ большым павышэньнем непасрэднага практычнага ўдзелу ў вялікай сацыялістычнай будоўлі.

Справа гонару кожнага камсамольца, кожнага маладога пралетара — быць перадавым байцом за асваеньне, за аўладаньне новай тэхнікай, за аўладаньне вышынямі навукі, культурна жыць, прадукцыйна працаваць, хварэць душой за бальшавіцкі парадак на вытворчасьці, вучыцца, вучыць на і яшчэ раз вучыцца, глыбока ведаць вучэньне Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Справа гонару кожнага камсамольца, кожнага маладога калгасьніка быць сапраўдным арганізатарам калгаснай вытворчасьці, непрымірна выкрываць недабітае кулацкае ахвосьпе, на справе змагацца за новае заможнае калгаснае жыцьцё, за ператварэньне ўсіх нашых калгасаў у бальшавіцкія калгасы.

Уборка, абмалот і пастаўкі ў нашай рэспубліцы праходзяць яшчэ зусім нездавальняюча. Ёсьць нямала камсамольскіх арганізацый, якія стаяць у баку ад гэтых важнейшых рашаючых задач. Вазьмеце пытаньне з ільнацерабілкамі «Камсамолка». Яны ў нас яшчэ скарыстоўваюцца проста злачынна. А камсамольцы-ж зьяўляюцца шэфамі ільнацерабілкі.

Наша партыя ачышчае свае рады. Чыстка партыі — вышэйшая форма бальшавіцкай самакрытыкі. Камсамол павінен стаць сапраўдным актыўным дапаможнікам партыі ў гэтай справе.

Шчыльней рады вакол партыі Леніна—Сталіна!

Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму! Вышэй сьцяг барацьбы за генэральную лінію нашай партыі, за аўладаньне тэорыяй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна!

ЗВАРОТ ВЫКАНКОМУ КІМ

да рабочай, беспрацоўнай, сялянскай і вучнёўскай моладзі, да салдат, матросаў і рэкрутаў, да моладзі ўсіх прыгнечаных нацыянальнасьцяй, да членаў сацмолу, хрысьціянскіх арганізацый і ашуканай фашыстамі моладзі, да працоўнай моладзі ўсяго сьвету

Камуністычны Інтэрнацыянал моладзі зварачаецца да вас з баявым рэвалюцыйным заклікам — выйсьці 1 верасьня, у XIX МЮД, на вуліцы, выступіць наперакор тэрору і рэакцыі магутнымі калёнамі і баявымі стачкамі супроць крывавай фашысцкай дыктатуры, супроць пагрозы вайны, на абарону СССР, супроць голаду, галечы і прыгнечаньня мільёнаў працоўных.

МАЛАДЫ ПРАЦОЎНЫ!

Чаму мы, камсамольцы, зварачаемся да цябе з заклікам да барацьбы? За чые інтарэсы і за якія патрабаваньні ты павінен змагацца?

Чатыры гады апустошваючага крызісу кінулі дзесяткі мільёнаў пралетараў і сялянства ў бяздонне галечы і голаду. Вырасла мільённая армія беспрацоўных, асуджаная на голад, галечу і жабрацтва. Моладзь, канчаючы школу, адразу трапляе ў гэту армію беспрацоўных. Большасьць маладога пакаленьня рабочай клясы ня мае магчымасьці знайсьці работу.

Моладзь вымушана лепшыя гады свайго жыцьця, сваю маладосьць праводзіць у прымусовай бязьдзейнасьці, у галечы, у голадзе. Буржуазія бязьлітас на грабіць апошнія грашы з заработнай платы дапамог вашых бацькоў і братоў, пазбаўляе вас усіх тых крохаў, якімі вы карысталіся раней.

Па адным толькі законе аб праверцы патрабоўнасьці ў Англіі кіне паўмільёна маладых беспрацоўных зьняты з дапамогі. Фашысты ў Германіі, а за імі і буржуазія амаль усіх капіталістычных краін загняюць сотні тысяч моладзі ў лягеры прымусовай працы, на катаржныя работы, аддаюць іх на волю фашысцкіх эфіцэраў, для ваеннай муштры, для падрыхтоўкі гарматнага мяса.

Тыя «шчасьліўцы», якія яшчэ сёньня працуюць на заводах, кожны дзень чакаюць звальненьня; ім зьніжаюць і без таго жабрацкую заработную плату; за кожную спробу змагацца іх выкідваюць з заводу.

Вучняў прафшкол прымушаюць вучыцца бясплатна і за нікчэмную плату выконваць работу дарослых рабочых. Пасьля сканчэньня школы яны не знаходзяць работы. Капіталісты клапоцяцца зараз толькі аб аднэй кваліфікацыі для моладзі—аб яе кваліфікацыі ў якасьці будучых салдат.

Калі мукі голаду і абурэньня бяспраўем становяцца нявыносьнымі і вымушаюць вас пратэставаць, супроць вас пасылаюць паліцыю, войскі і фашысцкія банды для захаваньня «парадку» і «спакою», для «ўнушэньня павагі» да бацькаўшчыны і ўраду.

Вас заклікаюць пераносіць недастачы і ахвары ўсяго бацькаўшчыны і нацыі. Але ж [illegible], гэта ў большасьці сваёй рабочыя і [illegible] працоўныя, якія ад гэтых ахвяр нічога не атрымліваюць.

Ад імя нацыі вас прымушаюць галадаць.

Ад імя нацыі вас расстрэльваюць.

Ад імя нацыі рыхтуюць вас да новай вайны!

Дзе выхад з гэтага становішча?

Фашысты распальваюць нацыянальную варожасьць, запэўнічыць вас, што ратунак у заваяваньні новых зямель; яны ўводзяць прымусовую працу, яны прабуюць зьнішчыць рэвалюцыйны рух.

Малады працоўны! Ці патрэбна табе польская, французская, нямецкая зямля і калёніі? Хіба польскі рабочы жыве лепш за нямецкага? Хіба французкі рабочы грабіць ангельскага рабочага? Ці ня ясна табе, што ад усяго гэтага выігрываюць толькі капіталісты?

Сацмол — арганізацыя, якая мае нахабнасьць называць сябе вялікім сацыялістычным імем,—выхоўвае моладзь у рабскім, нацыяналістычным духу і прыкрывае сваю раскольніцкую паліты ку мнімарэвалюцыйнай фразэй.

Каталіцкія і іншыя юнацкія арганізацыі заклікаюць вас да капітуляцыі і надзеі на лепшую будучыню, якую вам «падарыць» капіталісты.

Якава цана ўсім гэтым словам? Кожны з вас бачыць гэта на прыкладзе Германіі. У Прусіі ва ўладзе былі сацыял-дэмакраты. Ці дапамаглі яны чым небудзь моладзі? Іменна яны, праследуючы рэвалюцыйныя арганізацыі, раскалваючы рабочую клясу, заклікаючы да галасаваньня за Гінэнбурга, дапамаглі фашыстам прысьці да ўлады.

Тое, што можа даць моладзі фашызм, вы бачыце на прыкладзе Італіі, Польшчы і Германіі. Гітлераўскія банды топяць у крыві ўсякую спробу дарослых і моладзі змагацца з капіталістамі. Правадыру рабочай клясы Германіі тав. Тэльману пагражае лёс Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург. У дарослых і моладзі адабраны ўсе заваяваньня раней палітычныя правы. Кампартыя, камсамол і іншыя рэвалюцыйныя арганізацыі загнаны ў падполье.

Ёсьць толькі адна краіна ў сьвеце, дзе ёсьць пралетарская дэмакратыя, дзе рабочы, селянін і моладзь цьвёрда глядзяць на сваю будучыню і ўпэўнены ў заўтрашнім дні,—гэта СССР.

На аснове пасьпяховага выкананьня першай пяцігодкі за чатыры гады працоўныя краіны Саветаў пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў і правадыра тав. Сталіна паставілі перад сабой новыя, нябачаныя ў гісторыі чалавецтва задачы — практычнай пабудовы бясклясавага, сацыялістычнага грамадзтва.

Савецкая краіна ператварылася ў магутную індустрыяльную краіну. На аснове калектывізацыі сельскай гаспадаркі пралетарыят ліквідаваў у вёсцы кулака, жорсткага клясавага ворага будаўніцтва сацыялізму.

СССР — гэта адзіная краіна, дзе няма крызісу, дзе ёсьць росквіт прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, тэхнікі і культуры.

Іменна таму вочы працоўных усяго сьвету зьвернуты на Савецкі Саюз.

Сьвет нагадвае зараз парахавы склеп.

На Далёкім Усходзе і ў Паўднёвай Амэрыцы ўжо больш двух год адбываецца вайна. Усе міжнародныя канфэрэнцыі яшчэ больш абгаляюць супярэчнасьці паміж капіталістычнымі дзяржавамі.

У пошуках выхаду з крызісу буржуазія рыхтуе новую сусьветную бойню за рынкі. У гэтай вайне моладзь будзе складаць асноўныя кадры.

Вас, маладыя рабочыя, сяляне, служачыя і студэнты, рыхтуюць зараз да «гонару» першымі загінуць на полі бітвы за інтарэсы буржуазіі. Для гэтага ўведзена прымусовая сыстэма фашызацыі і мілітарызацыі моладзі.

У лягерах прымусовай працы, у дапрызыўных арганізацыях, у спартыўных і іншых саюзах, у школе і унівэрсытэтах—усюды вас вучаць ваеннаму майстэрству, усюды з вас рыхтуюць бу дучых салдат капіталістычных армій.

На юнацкім сусьветным кангрэсе барацьбы супроць вайны і фашызму, які адбудзецца 22 кастрычніка ў Парыжы, прадстаўнікі мільёнаў маладых працоўных прадэманструюць сваю гатоўнасьць змагацца з імпэрыялістычнай вайной, абараняць СССР.

1-га верасьня XIX МЮД—дзень агляду баявых сіл працоўнай моладзі. Нашы сілы правяраюцца ў барацьбе. Посьпех гэтай барацьбы залежыць ад нашай баявой волі, ад нашай арганізаванасьці. Толькі ў непрымірнай клясавай барацьбе мы можам абараняць нашы патрабаваньні.

Толькі магутны і [illegible] фронт усіх працоўных можа [illegible] фашызму.

Толькі пралетарская рэвалюцыя і дыктатура пралетарыяту вызваляюць вас ад ланцугоў работы, галечы і голаду.

Яднайцеся ў адзіным фронце барацьбы вакол адзіна рэвалюцыйнай арганізацыі рабочай клясы—кампартыі, якая вядзе вас да канчатковай перамогі над капіталам.

Сілы рэвалюцыі растуць і мацнеюць ва ўсім сьвеце. У Германіі пад кіраўніцтвам гераічнай кампартыі рабочая кляса рыхтуецца да перамогі над фашызмам. У Кітаі Чырвоная армія адбіла пяты паход катаў з Гоміндану. Саветы Кітаю дабіліся новых рашаючых посьпехаў. Шырыцца рэвалюцыя ў Гішпаніі. Расьце фронт стачачнай барацьбы ў Польшчы, Чэха-Славакіі і іншых краінах. У Індыі ангельскі ўрад вымушэн пасылаць рэгулярныя войскі супроць паўстаўшых правінцый.

МАЛАДЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ! Стварайце адзіны фронт барацьбы за свае эканамічныя і палітычныя патрабаваньні, супроць вайны і фашызму, уступайце ў камуністычны саюз моладзі!

КАМСАМОЛЬЦЫ! Ідзеце сьмялей на заводы і прадпрыемствы, у лягеры працоўнай павіннасьці, школы, у армію, у масавыя арганізацыі моладзі, вядзеце там рэвалюцыйную работу!

ВЫКАНКОМ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ МОЛАДЗІ ЗАКЛІКАЕ ЎСЮ ПРАЦОЎНУЮ МОЛАДЗЬ 1 ВЕРАСЬНЯ ПА ДЭМАНСТРАЦЫІ, СТАЧАК І [illegible] ПРАТЭСТУЛЕНЬНЯЎ СУПРОЦЬ [illegible]ЗМУ, ВАЙНЫ І ГОЛАДУ.

Супроць нацыяналізму і шавінізму! Вышэй сьцягі клясавай барацьбы і баявога інтэрнацыяналізму! Працоўная моладзь усіх краін!

Далоў фашысцкую дыктатуру, голаду, галечы і тэрору! Ганьба здрадніцтву рабочай клясы, правадыром II Інтэрнацыяналу і СІМ, якія наносяць удар у сьпіну рэвалюцыйнага пралетарыяту!

Мы шлем наша баявое і рэвалюцыйнае прывітаньне лепшым змагаром за справу рабочай клясы, якія томяцца ў фашысцкіх засьценках. Мы патрабуем вызваленьня тав. Тэльмана і іншых палітычных зьняволеных.

Мы вітаем гераічныя камсамолы Германіі, Японіі, Польшчы і Кітаю і ў іх асобе ўсю рэвалюцыйную моладзь сьвету.

Рэвалюцыйнае прывітаньне ўдарнай брыгадзе міжнароднага пралетарыяту—рабочым і калгаснікам СССР, слаўнай камуністычнай партыі бальшавікоў, ленінскаму чырвонасьцяжнаму камсамолу і правадыру рабочай клясы ўсяго сьвету тав. Сталіну!

ЮНЫЯ ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН! ЗЛУЧАЙЦЕСЯ ПАД СЬЦЯГАМІ БАРАЦЬБЫ ЗА ДЫКТАРУРУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ПАД СЬЦЯГАМІ КАМІНТЭРНУ І КІМ!

Няхай жыве XIX МЮД!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ МОЛАДЗІ.

Камсамол Германіі на перадавых пазыцыях антыфашысцкай бараць[illegible]

Кіруемы камуністычнай партыяй германскі камсамол паказвае ўзоры гераічнай барацьбы супроць фашызму. 5.000 камсамольцаў кінуты ў фашысцкія турмы і канцэнтрацыйныя лягеры. Многія з іх ня выносьлі катаваньняў. Таварышы Афа і Обэрт —сакратары раённых арганізацый КСМ у Бэрліне — пасьля тыднёвага знаходжаньня ў фашысцкіх засьценках страцілі розум. У Хэмніцы 30 камсамольцаў былі падвергнуты катаваньням у фашысцкіх казарках. Але ні адзін камсамолец, ня гледзячы на нечалавечыя катаваньні, нічога ня выдаў. Калі гэтых камсамольцаў выпусьцілі на свабоду, яны былі поўнавымі лідамі. На гледзячы на гэта, ні адзін з іх не адышоў ад камсамолу. Зараз гэтыя таварышы — лепшыя актывісты арганізацыі.

Фашысты стараюцца перш за ўсё зьнішчыць кіруючы актыў. Але на зьмену расстрэленым і замучаным у камсамол прыходзяць новыя тысячы маладых рабочых, вырастаюць новыя бальшавіцкія кадры кіруючага актыву. Гэты актыў прыходзіць на кіруючую работу з вялікім запасам рэвалюцыйнай энэргіі і ініцыятывы.

Малады рабочы-камсамолец быў прыцягнут на работу інструктара рурскім абласным камітэтам камсамолу. Гэты таварыш, праводзячы інструктарскую работу ў аднэй з арганізацый вобласьці, павінен быў на наступны дзень у пэўны тэрмін пасьці ў другую арганізацыю, якая знаходзіцца ў 55 кілёмэтрах. Ня маючы ні грошай, ні вэлёсыпэду, гэты камсамолец ноччу прайшоў пехатою ўсе 55 кілёмэтраў.

Ячэйкі і паасобныя камсамольцы праяўляюць вялікую ініцыятыву ў барацьбе супроць фашысцкіх банд.

У Вагрбаку штурмавікі прабавалі правесьці сваю дэманстрацыю ў рабочых кварталах. Усе камсамольскія арганізацыі былі пастаўлены на ногі для таго, каб мабілізаваць рабочую моладзь супроць гэтай фашысцкай вылазкі. Камсамольцы абыходзілі рабочыя дамы, праводзілі лятучія мітынгі і тут-жа на месцы стваралі атрады самаабароны. Калі фашысты пашлі маршам па вуліцы рабочага кварталу, яны сустрэлі дружны адпор усяго працоўнага насельніцтва: іх закідалі каменьнямі, з вокнаў на іх галовы пляцелі кавточныя гаршкі, з балькона на іх выліваліся памыі... Фашысты адступілі.

Непрымірная барацьба камсамолу супроць фашызму яшчэ больш умацавала яго аўтарытэт у масах рабочай і працоўнай моладзі. Ня гледзячы на вялікія страты, камсамол утрымаў свае пазыцыі на асноўных прадпрыемствах.

Са дня ў дзень у Германіі ўзмацняецца нездавальненьне мас. Рэчаіснасьць пацьвярджае правільнасьць указаньняў ВККІ аб тым, што «кожны новы дзень уроду Гітлера будзе ўсё больш ясна паказваць ашуканства, ахвярамі якога сталі масы, што пайшлі за Гітлерам. Кожны новы дзень будзе ўсё яснейй паказваць, што Гітлер вядзе Германію да катастрофы» (рэзалюцыя прэзыдыуму ВККІ па дакладу тав. Гекерта).

Перад германскім камсамолам задача заваяваць і павесьці найшырэйшыя масы рабочай моладзі.

Камсамол ставіць перад сабой задачу выкрыць сацыяльную і нацыянальную дэмагогію фашызму, мабілізуючы моладзь на барацьбу за зрыў кожнага мерапрыемства фашыстаў.

Станоўчы вопыт арганізацыі стачачных бояў моладзі ў лягерах прымусовай працы і на заводах павінен быць пакладзен у аснову штодзённай работы ўсяго Саюзу.

Фашысцкая Германія ўзмоцнена скапочвае адзіны імпэрыялістычны фронт барацьбы супроць Савецкага саюзу. Выкрыцьцё антысавецкіх плянаў германскага фашызму, мабілізацыя моладзі на барацьбу супроць гэтых плянаў—адна з важнейшых задач КСМГ.

Да XIX МЮД'у германскі камсамол узмацніце сваю барацьбу супроць мілітарызацыі моладзі. КСМГ ставіць перад сабой задачу прасякнуць у школы, на вытворчасьць, у лягеры працоўнай павіннасьці, у спартыўныя і іншыя арганізацыі, у якіх мілітарызуюцца мільёны моладзі, і мабілізаваць гэту моладзь супроць падрыхтоўкі вайны.

Уся работа камсамолу павінна быць падпарадкавана асноўнай задачы—правядзеньню штодзённай мабілізацыі і падрыхтоўкі шырокіх мас рабочай і працоўнай моладзі да рашаючых баёў супроць фашысцкай дыктатуры.

Н. Пранаф'еў.

Мюдаўскія дні ў Савецкім саюзе

У мюдаўскіх калёнах са сьцягамі ідуць героі вугалю, хлеба, чыгуну, вагонаў, паравозаў.

Вось Макеўскі камсамол. Да XIX МЮД'у ён звыш пляну даў эшалён вугалю ў падарунак свайму сьвяту. Вакол эшалёну абвешчана спаборніцтва сярод шахт на права быць удзельнікам гэтай вуліцы дэманстрацыі.

Шахта «Іван» на мюдаўскі рахунак уносіць 677 тон вугалю.

ГАРЛОЎКА — шахта «Арцём». Камсамол у падрыхтоўцы да МЮД'у перавыканаў жнівеньскі плян на 90 тон вугалю. Гэта была яго задача даць у падарунак свайму сьвяту.

5-я ўсходняя лава — камсамольская лава. Яна першая адправіла свой падарунак МЮД'у — 60 тон антрацыту.

1-я камсамольская лава ўнесла на бягучы рахунак МЮД'у 500 тон вугалю.

24-ты камсамольска-маладзёжны вучастак грузіць свой падарунак XIX МЮД'у — 500 тон.

Камсамол калгасных палёў выходзіць на дэманстрацыю XIX МЮД'у разам з абозамі шпаніцы, жыта, аўса, ячменю.

СТАЛІНО. Піянэры распусьцілі свае вьюньні на палі. Кожны з іх з захапленьнем падгапяў свой вучастак, падбіраючы зтублены нават маленькі каласок. Уся арганізацыя піянэраў краіны разышлася па палёх. Сабралі дзесяткі тон хлеба.

Сталінскія піянэры арганізавалі ў падарунак МЮД'у чырвоны абоз з сабраных каласоў.

ДНЕПРАПЭТРОЎСК. Дняпроўскі камсамол дзяо звыш пляну да МЮД'у выпусьціў паравоз і адрамантаваў 5 вагонаў.

Камсамол заводу імя Дзяржынскага паставіў на райкі асеньня-зімовых перавозак у падарунак XIX МЮД'у — 10 вагонаў.

МЕНСК.

Завод «Камунар». Мэханічны цэх звыш пляну да 1 верасьня выпусьціў 1 малочную помпу. Блашаны цэх звыш пляну дае 1.000 хлебных форм.

Завод «Бальшавік». «Бальшавік» сустракае дзень XIX МЮД'у арганізацыяй у першым і другім хромавых цэхах трох гаспадарча-разрахунковых камсамольскіх брыгад імя XIX МЮД'у.

У парадку падрыхтоўкі да юнацкага дня арганізаваны новыя дзьве брыгады «ЛК», якія правяраюць падрыхтоўку магазынаў ЗРК Менску да прыёмкі гародніны, бульбы.

Завод ланцугоў «Гальля». Калектыў ЛКСМБ абавязаўся звыш пляну здаць 150 мэтраў ланцугоў. Прэміруюцца 2 лепшыя камсамольцы-ўдарнікі і арганізаваны дзьве брыгады «ЛК», якія 25 жніўня арабілі агляд сваёй сталовай і «налёт» на рацыяналізатарскае бюро заводу.

* * *

І так у кожным горадзе, у кожным раёне нашага Саюзу. Камсамольцы ўдар нікі пад кіраўніцтвам партыі змагаюцца за будаўніцтва сацыялізму.

Камсамол савецкіх раёнаў Кітаю

У савецкіх раёнах Кітаю КСМ вырас за год з 80 тыс. да 105 тыс. Камсамол зьяўляецца актыўнейшым памочнікам партыі як у справе абароны і папярэдняя савецкіх раёнаў, так і ў справе ўнутранога будаўніцтва і культурна-масавай работы сярод мас пасельніцтва.

Камсамолам праводзіцца сыстэматычная вярбоўка камсамольцаў і працоўнай моладзі ў рады Чырвонай армії, суправаджаемая масава-растлумачальнай работай аб яе задачах. Па старых (і далёка пяпоўных) вестках, у раёне 4-ай Чырвонай армії толькі за два месяцы камсамолам было завербавана больш 7 тысяч чалавек у Чырвоную армію і больш чым 1 тыс. чал. у Чырвоную гвардыю. З гэтых 8 тысяч чалавек тысяча—камсамольцы. У паўночна-заходнім Аньхуэй за адзін месяц завербавалі 2.166 чал., з іх 207 камсамольцаў; у заходнім Фуцзяне за адзін месяц уцягнулі ў Чырвоную армію 400 чал., на поўдні Цзянсі за месяц уцягнута 1.000 чал.; у раёне ізеяньня часьцей Хо-Луна за два м[illegible] уцягнута 2.500 чалавек [illegible]. д.

Апрача сыстэматычнай вярбоўкі моладзі ў рады Чырвонай армії, КСМ аказвае ёй вялікую матар'яльную дапамогу. Так, напрыклад, [illegible]ьца мі ў раёне 4-га к[illegible] [illegible]цы арганізаваў [illegible] порадача чы[illegible] армейцам 411 пікуляў рысу, 324 даляры, 4.048 пар камашаў, зробленых дзяўчатамі з рысавай саломы. У савецкіх раёнах правінцыі Аньхуэй перадала 80 пікуляў рысу, 50 пікуляў шпаніцы, 225 долараў, 300 яек, 436 кітайскіх фунтаў макарону, 987 пар камашаў з матэрыі і 754 пары з саломы і інш. З раёну дзеяньня армії Хо-Луна пішуць, што грошы на дапамогу Чырвонай армії камсамольцамі «зьбіраліся капейкамі, а рыс пікулямі».

Ва многіх месцах (заходні Фуцзян, Аньхуэй, Цзянон) камсамольцамі праводзіцца суботнікі для дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў (уборка рысу, апрацоўка зямлі і г. д.).

Вялізарную дапамогу КСМ аказвае Чырвонай армії праз сваю масавую дапаможную арганізацыю—«Маладую гвардыю», якая налічвае ў сваіх радох некалькі сот тысяч працоўнай моладзі. Члены «Маладой гвардыі», рыхтуючыся стаць чырвонаармейцамі, прымаюць актыўны ўдзел у партызанскіх дзеяньнях (часта з аднымі старымі мячамі і дубінкамі), дэзарганізуючы тыл праціўніка і палягчаючы гэтым перамогу Чырвонай армії.

Камсамольцы, моладагвардэйцы і ўся працоўная моладзь савецкага Кітаю праявілі ўзоры нячуванага гераізму, змагаючыся ў першых радох Чырвонай армії, якая з посьпехам адбівае атак [illegible] аднаных армій гамінданаўскай контр-рэвалюцыі і міжнародных імпэрыялістаў. Нават зьлейшыя ворагі моладзі савецкага Кітаю, такія, як генэрал Хэ-Цзян, камандуючы аднэй з карных экспэдыцый супроць Чырвонай армії, павінен быў прызнаць, што «моладзь б'ецца, як чэрці».

КСМ савецкіх раёнаў аказвае кампартыі шырокую дапамогу ў справе ўсямернага ўмацаваньня яшчэ маладой савецкай улады, змагаецца супроць змоў і хітрасьцяй памешчыкаў, ліхвяроў, джэнтры, кулакоў, трацкістаў, чэндусоістаў, згуртоўваючы вакол саветаў шырокія пласты працоўных і працоўнай моладзі. Працоўная моладзь адыгрывае вялікую ролю ў падрыхтоўцы і правядзеньні выбараў саветаў, зьездаў, канфэрэнцый, у правядзеньні ўсіх палітычных, гаспадарчых і культурных мерапрыемстваў савецкай улады, у пры ватнасьці, у правядзеньні ўраўняльнага перадзелу зямлі.

Актыўны ўдзел КСМ за савецкія тэрыторыі і яго барацьба за інтарэсы працоўнай моладзі заваявалі яму шырокую папулярнасьць у масах моладзі. У савецкіх раёнах КСМ зьяўляецца масавай арганізацыяй працоўнай моладзі. Апошняя перамогі саветаў і бясспрэчна ўзросшая роля КСМ ва ўсёй барацьбе прывялі пад яго сьцяг новыя дзесяткі (калі ня сотні) тысяч працоўнай моладзі Кітаю.

Аб выкрытым факце сабатажу чысткі партыі на фабрыцы імя КІМ

Пастанова гарнамісіі па чыстцы

Гарнамісія канстатуе, што ў працэсе чысткі парткалектыву фабрыкі імя КІМ з боку старшыні фабкому Кашкінавай (член партыі з 1931 году) былі праяўлены выключна недапушчальныя антыпартыйныя дзеяньні, якія выявіліся ў папярэдняй змове, нават подкупе (выдача двум работніцам беззваротна па 10 руб., абяцаньне прадставіць кватэру) толькі для таго, каб гэтыя работніцы выступілі перад сходам па чыстцы ў абарону Кашкінавай, якая апартуністычна праваліла работу фабкому, зжылася з клясава-чужымі элемэнтамі, шкодзіла сьведчыць аб яўным перараджэньні разлажэньні Кашкінавай.

Пацьвердзіць пастанову ячэйковага правяркому аб выключэньні Кашкінавай з радоў партыі і ўхваліць абмеркаваньне гэтага пытаньня на масавым сходзе рабочых фабрыкі імя КІМ.

Адзначыць, што з боку бюро парткалектыву была праяўлена палітычная блізарукасьць і недаацэнка гэтага пытаньня, што сьведчыць аб наяўнасьці сямейнасьці ў парткалектыве фабрыкі.

Прасіць бюро РК КП(б)Б прыняць адпаведныя меры ў адносінах да бюро парткалектыву фабрыкі імя КІМ.

СЕНЬНЯ ПАЧАУСЯ НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Узброіць вучняў асновамі навук, канчаткова ліквідаваць „карэнны недахоп“ школы, яшчэ вышэй узьняць інтэрнацыянальнае выхаваньне школьнікаў, па-бальшавіцку змагацца за сапраўды ленінскія адносіны да настаўніка—вось баявыя задачы, якія стаяць перад кожнай партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай і савецкай арганізацыяй, перад шырокімі масамі асьветнікаў.

КАНДЫДАТ НА ПРЭМІЯВАНЬНЕ

Сёньня шумная, адпачыўшая за лета школьная дзетвара запоўніць сьветлыя, занова адрамантаваныя аўдыторыі школы. Наша школа цалкам і поўнасьцю падрыхтавалася да заняткаў, як таварыцца, аж да крэйды і апучкі.

Яшчэ з канца мінулага навучальнага году мы задаліся мэтай, апрача ўсяго іншага, падрыхтаваць школьныя пакоі так, каб **самы выгляд школы выхоўваў вучняў**, прывучаў іх да беражлівых адносін да дзяржаўнай маемасьці, прышчапляў вучням прывычкі гігіены і санітарыі.

І вось цяпер пакаі закончаны малярныя работы, адрамантавана ўся школьная мэбля і інвэнтар. **Арганізован душ пры фізкультурнай залі**, работа медпункту ў школе. Рамонт выканан поўнасьцю, добраякасна, на суму **9.500 руб.**, па расцэнках, вызначаных урадам.

Сьветла, чыста і ўтульна ў школе. Створана здаровая, бадзёрая абстаноўка для энергічнай, пасьпяховай вучобы дзетвары.

Зайдзеце да нас у школу, вы ўбачыце **поўнасьцю падрыхтаваны габінэт педагагічнай практыкі. Выпрацаваны формы плянаваньня вучэбных высьпіклін. Поўнасьцю прарэцэнзаваны і прагледжаны новыя праграмы і падручнікі, якія выйшлі да гэтага часу. Настаўнікі маюць схэматычныя гадавыя пляны па сваіх прадметах. Складзены клясныя журналы на ўсе групы. Школа поўнасьцю ўкамплектавана вучнямі.**

Для таго, каб лепш падрыхтавацца да новага навучальнага году, патрэбна было зірнуць назад, усьвядоміць, абагуліць вопыт мінулага навучальнага году, **улічыць памылкі** і на аснове такога аналізу склясьці плян падрыхтоўкі.

Гэта было зроблена на сходах настаўнікаў адразу-ж пасьля сканчэньня мінулагодніх заняткаў.

Пры выдатнасьці мерапрыемстваў мы выходзілі з аснову налажэньня, што карэнны лад усёй школы не ліквідаваны служаннем мінулага. І мы асабліва ўпор зрабілі на лепшую падрыхтоўку навучальнага году. Мы паставілі за мэту прыняць падабраць мэтодыкі асобных прадметаў. Кожны паасобны ўзяўся за летні час прапрацаваць як менш адной мэтодыкі на сваім прадмеце, прарэцэнзаваць стабільны падручнік, вывучыць праграму. Вось чаму мы асабліва ўпор зрабілі на папаўненьні габінэту педагагічнай практыкі неабходным мэтадычным і дыдактычным матар'ялам.

Выканаўшы мінулага падрыхтоўчага пляну стала магчымым выключна тому, што настаўніцкі калектыў школы глыбока ўсьвядоміў усю палітычную важнасьць пастаноў ЦК партыі аб школе. Было разгорнута сапраўднае сацыялістычнае спаборніцтва паміж настаўніцкімі брыгадамі. Змагаючыся за пярэдпыства ў падрыхтоўцы да навучальнага году, некаторыя настаўнікі праявілі сябе сапраўды па-геройску. Вось, напрыклад, у майстэрні не хапала даўбежнага варштату па дрэву. Ня было дзе яго купіць. І вось тав. **ДАВІДОЎСКІ**—інструктар па мэталю—ў часе свайго адпачынку ўзяўся сам зрабіць гэты варштат. **Да 1-га жніўня варштат быў гатоў. Ён быў зроблен у якасьці падарунку школе ад ударніка-інструктара тав. Давідоўскага.**

У галіне арганізацыі па-за-школьнай працы спэцыяльная брыгада настаўнікаў ужо распрацавала каляндарны плян. Новае ў гэтым пляне тое, што ён пабудован па заказе саміх настаўнікаў. Гэты заказ выцякае непасрэдна з праходзімага праграмнага матар'ялу, вызначан тэрмін гэтай работы, улічаны асаблівасьці ўзросту дзяцей. У гэтых плянах упяршыню намечана правядзеньне алімпіяды на лепшых дэкляматараў, музыкантаў, танцораў, па лепшых матэматыкаў, фізыкаў, канструктараў і г. д.

Значную дапамогу ў падрыхтоўцы навучальнага году мы аказалі падшэфным школам Бараўскога сельсавету. Два разы нашы настаўнікі правялі падшэфныя школы. З 16 жніўня былі наладжаны выезды настаўнікаў для мэтадычнай работы. Пад нашым кіраўніцтвам там былі складзены пляны працы настаўнікаў, праведзены настаўніцкія курсы, прапрацаваны новыя праграмы і стабільныя падручнікі. Пры дапамозе нашых настаўнікаў былі падабраны дапаможнікі, быў абсталёван габінэт і лабараторыі Масюкоўскай ШКМ.

І ўсё-ж такі, нам неабходна дапамога і ў першую чаргу дапамога трэсту грамадзкага харчаваньня. Трэст павінен узяць кіраўніцтва сталоўкай у свае рукі, узяць штат у свае рукі і поўнасьцю забясьпечыць сталоўку. Наркамасьветы павінен тэрмінова даслаць навышэйшыя праграмы і выправіць тыя памылкі, якія заўважаны ў праграмах. А памылкі ёсьць. Напрыклад, у трэціх і чацьвертых групах па працоўным навучаньні па сетцы вызначана 76 гадзін, а праграма разлічана на 112 гадзін. Праграма на гісторыі разлічана аж да 1 чэрвеня. Ці-ж хопіць пасьля гэтага часу для правядзеньня іспытаў?

Мажымальная выразнасьць, канкрэтнае дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва школай—зарука посьпехаў. **За канчатковае зьнішчэньне карэннага недахопу—мы гатовы.**

Загадчык Менскай 25-ай ФЗС імя Чарвякова — ЦМЫГ.

З чым мы прышлі да новага навучальнага году

(Гутарка з наркомам асьветы БССР т. Чарнушэвічам)

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО і пры актыўным удзеле ва ўсесаюзным агляде шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і працоўных, Беларуская ССР новы навучальны год сустракае радам новых дасягненьняў. УПЯРШЫНЮ ЗА ЎСЁ ІСНАВАНЬНЕ БССР НАШЫ ШКОЛЫ АТРЫМАЛІ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ, якія забясьпечваюць асьваеньне дзецьмі асноў навук. У мінулым годзе да пачатку заняткаў было вупушчана з друку ўсяго 15 пад ручнікаў; у гэтым годзе на 30 жніўня выпушчаны з друку 82 СТАБІЛЬНЫЯ падручнікі. Усе яны адпраўлены на рады і ў большасьці знаходзяцца ў школах. Да пачатку заняткаў беларуская школа падручнікамі забясьпечана амаль поўнасьцю. Горш стаіць справа са школамі нацменшасьцяй. Беларусь плян выданьня яўрэйскіх і польскіх падручнікаў выканала поўнасьцю. У бліжэйшыя дні выходзяць апошнія тры падручнікі для літоўскіх школ. Але ня выканалі сваіх абавязацельстваў Украіна, а таксама выдавецтва Масквы «ЭМЭС» і «Прометей», якія замест 171 падручніка дзелі нам пакуль што толькі 40 стабільных падручнікаў для нацменаўскіх школ.

Да пачатку работы настаўніцкіх канфэрэнцый праграмы 1 канцэнтру, а таксама па асноўных прадметах II канцэнтру былі на месцах. Распрацавана 12 мэтадычных лістоў па асноўных пытаньнях школьнай работы, але Наркам асьветы і Дзяржвыдавецтва Беларусі не змаглі забясьпечыць выпуск іх да пачатку вучэбных заняткаў. Прыняты ўсе захады, каб гэтыя мэтадычныя лісты былі даны школам у бліжэйшыя дні.

Ажыцьцяўляючы ўсеагульнае навучаньне за сямігодку, мы ў гэтым годзе школамі I і II канцэнтру ахопім на 15.000 дзяцей больш, чым у мінулым годзе. Значна павялічваецца ахоп дзяцей III канцэнтру, шляхам адкрыцьця новых восьмых груп і разгортваньня дзевятых.

Для ўкамплектаваньня школ I канцэнтру ўсіх нацыянальнасьцяй трэба было падрыхтаваць 5.400 выкладчыкаў. Выпушчана з пэдтэхнікумаў і падрыхтавана праз пэдагагічныя курсы 5.800. Такім чынам школы I канцэнтру будуць укамплектаваны поўнасьцю. Пагражае небясьпека па ўкамплектаваньні II канцэнтру. З-за дрэнных работы сэктару кадраў Наркамасьветы і няўважлівых адносін да гэтай справы з боку раду райАНА, плян выпучэньня лепшых выкладчыкаў I канцэнтру ў II выканан толькі на 67,5 проц. Вылучана і прашчана праз спэцыяльныя курсы 1.355 настаўнікаў. Для II канцэнтру пакапае выкладчыкаў некаторых дысцыплін, галоўным чынам выкладчыкаў грамадзазнаўства. Немі прымаюцца меры для ліквідацыі гэтага прарыву шляхам далейшага пересоўваньня лепшых пераваных настаўнікаў першага канцэнтру ў другі, а таксама шляхам звароту на пэдагагічную работу настаўнікаў, якія працуюць не па сваёй спэцыяльнасьці.

Да пачтку вучэбных заняткаў большасьць нашых школьных будынкаў адрамонтавана. Упередзе ў гэтай справе ідуць АСІПАВІЦКІ, БАРЫСАЎСКІ, ЛАГОЙСКІ і рад іншых раёнаў. Злачынна правальваюць: рамонт школ БЯГОМЛЬСКІ, ГЛУСКІ, СІРОЦІНСКІ, ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁНЫ. Вялікім мінусам зьяўляецца невыкананьне ў тэрмін пляну новага будаўніцтва. НА 1-е ВЕРАСЬНЯ З 394 ШКОЛ СКОНЧАНА ТОЛЬКІ 55 ШКОЛ. Трэба мабілізаваць усе сілы і сродкі, каб пабудовы ўсіх астатніх школ закончыць на працягу верасьня месяца.

Для павялічэньня школьнай плошчы і забясьпячэньня школ памяшканьнямі за летні перыяд перададзена і замацавана за школамі каля 500 былых кулацкіх дамоў.

Да недахопаў падрыхтоўкі да навучальнага году трэба аднесьці і тое, што мы невыстарчальна папоўнілі школы вучэбнымі дапаможнікамі і палітэхнічным абсталяваньнем. Усё-ж, і тых і другіх адпраўлена ў раёны на 775 тыс. руб. На першыя 2-3 месяцы школы забясьпечаны сшыткамі, алоўкамі і іншымі пісьмовымі прыладамі, але гэтага дастатковым прызнаць нельга.

Для лепшага прасоўваньня падручнікаў і розных вучэбных і пісьмовых прылад Наркамасьветы сумесна з ЦККК-РСІ на ўсіх вузлавых станцыях чыгункі арганізавалі кантрольныя пасты. Гэтае мерапрыемства дапамагае і дапамагае паскорыць тэмпы прасоўваньня падручнікаў і прылад для школ. Усё-ж, у асобных раёнах мы маем агідныя адносіны да забясьпячэньня школ падручнікамі, вучэбнымі і іншымі прыладамі, калі апошнія не выкупляюцца і не прасоўваюцца ў школы.

Настаўніцкія канфэрэнцыі ў большасьці раёнаў былі абслужены квалі фікаваным мэтадычным кіраўніцтвам. Цэнтр работы канфэрэнцый быў перанесен у сэкцыі, у якіх прапрацоўваліся праграмы, мэтады работы, распрацоўваліся вытворчыя пляны, а ў асобных раёнах (Лагойскі і інш.) для адна- і двухкамплектных школ былі распрацаваны цьвёрдыя расклады заняткаў.

Наркамасьветы у сваёй работе галоўную ўвагу зьвяртае школе. Пад такім кутом ідзе і павінна ісьці і перабудова раённых аддзелаў народнай асьветы. Наркамасьветай прагледжан склад загадчыкаў і інструктароў-мэтадыстаў. Для ўмацаваньня раённых аддзелаў народнай асьветы намі паслана звыш 100 лепшых пэдагогаў. Работа па ўмацаваньні раёну працягваецца.

Наркамасьветы, мясцовыя органы народнай асьветы, шырокія настаўніцкія масы мабілізаваліся на скончаньне ў самы кароткі тэрмін усіх недаробак, на ліквідацыю прарываў на асобных участках падрыхтоўчай работы. У ПЕРШУЮ ЧАРГУ НАМ ТРЭБА СКОНЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА І РАМОНТ ШКОЛ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ІХ АПАЛАМ, ДАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ ЎСЕ ПАДРУЧНІКІ, ПАПОЎНІЦЬ ШКОЛЫ ВУЧЭБНЫМІ ПРЫЛАДАМІ І ПАЛІТЭХНІЧНЫМ АБСТАЛЯВАНЬНЕМ, РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ ПА СТВАРЭНЬНІ ХАРЧОВЫХ ФОНДАЎ, УЗБРОІЦЬ НАСТАЎНІКАЎ МЭТАДЫЧНЫМІ ПРЫЛАДАМІ І З ПЕРШАГА-Ж ДНЯ ЗАНЯТКАЎ АРГАНІЗАВАЦЬ МЭТАДЫЧНУЮ ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКУ, АСАБЛІВА МАЛАДОМУ.

Усе мы, работнікі культурнага фронту, уся пралетарская грамадзкасьць павінны мабілізавацца на бальшавіцкае ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе, НА ПАВЫШЭНЬНЕ ЯКАСЬЦІ ШКОЛЬНАЙ РАБОТЫ, на ліквідацыю «карэннага недахопу», на ператварэньне нашай школы ў сапраўдную палітэхнічную школу Маркса-Леніна-Сталіна.

Перад намі стаіць задача яшчэ БОЛЬШ ПАВЫСІЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ У БАРАЦЬБЕ З БУРЖУАЗНА - НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫМІ І КЛЯСАВА ВАРОЖЫМІ ЭЛЕМЭНТАМІ НА ФРОНЦЕ БУДАЎНІЦТВА ПАЛІТЭХНІЧНАЙ ШКОЛЫ, разгарнуць рашучую барацьбу на аснове пралетарскага інтэрнацыяналізму, за правільнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Арганізатарам змоў супроць чысткі БАЛЬШАВІЦКУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ

Працоўная моладзь капіталістычных краін рыхтуецца да XIX МК

Францыя

ПАРЫЖ, 29. (Бепта). Пасьля нядаўнай забастоўкі на аўтамабільных заводах СІТРОЕНА, у якіх моладзь адыгрывала актыўную ролю, разгарнуліся эканамічныя баі ў СТРАСБУРГУ. У барыкадных баёх, якія адбываліся некалькі дзён у Страсбургу, рабочая моладзь займала адно з першых месц. Страсбургская забастоўка выявіла таксама дасягненьні французкага камсамолу ў антымілітарысцкай рабоце. Пасланыя ваеннымі ўладамі [illegible] выкоўтэгарычна адмовіліся [illegible] лепш прапрощь рабочых. Калі [illegible] разрабавала арыштаваных і сялян значдык салдаты, сабр[illegible] зрабілі першыя зарм, вызвалілі [illegible] крамку. Упередзе дараў. [illegible] цяжкая і разам з У скончанай [illegible]ота. Партыя пад кі-5-ці тысяч в[illegible]ьнага палкаводца тав. прымала ек[illegible]ена ідзе наперад да но-ці рэвалюц[illegible] У Страс[illegible] ходзіць ва ўмовах жорстпа [illegible] барацьбы. На цяперашт[illegible] яка прымае ўтончаныя фор-такласавы вораг разумее ролю пар-кі ў гэтай барацьбе. Таму клясава-ная элементы, прапешшыя ў нашы [illegible], каб з сярэдзіны школзіць, аказ-[illegible]ць шалёнае супраціўленьне пасьпя-[illegible]ховаму правядзеньню чысткі.

Іх тактыка ня простая. Яны на дзейнічаюць па стандарту.

Вораг у барацьбе супроць нас выкарыстоўвае усялякія мэтады.

Нядаўна былі апублікаваны ў «Правде» матар'ялы аб змове супроць чысткі ў Данецкай вобласьці.

Аналягічныя факты змовы выяўлены ў бабруйскай арганізацыі, факты, якія па сваім значэньні выходзяць за рамкі бабруйскай арганізацыі.

Група камуністаў ячэйкі дыспансэру на чале з райздравам Гершовічам і сакратаром ячэйкі Окунем «рыхтавалася» да чысткі.

Адчуваючы за сабой салідны «капітал» злачынстваў перад партыяй, яны распрацоўваюць свой плян падрыхтоўкі да чысткі. Іх мэта не дапамагчы камісіі па чыстцы выявіць (ды хіба гэта ў іх інтарэсах), а наадварот — замазаць сьлады злачынстваў, стварыць перад камісіяй уражаньне, што нібыта ўсё добра.

Стварэецца самаправерачная брыгада. Людзі ў гэту брыгаду падбіраюцца свае.

Брыгада несьпех складае вывады, што «ячэйка ідэалёгічна здаровая», карыстаецца аўтарытэтам у масах, «стварыла поўны (?) беспартыйны актыў, спраўляецца з гаспадарча-палітычнымі кампаніямі». Увогуле «ўсё ў парадку». Прычым самаправерачная брыгада ў складзе Жураўлёвай, Флейшэр не забывае запісаць, што галоўныя ўдарнікамі зьяўляюцца сямі Флейшэр і Жураўлёва, а сакратар ячэйкі Окунь — лепшы бальшавік.

Не пасьпела яшчэ наступіць чыстка партыі, а Окуні і Жураўлёвы своечасам сьпяваюць адзін аднаму дыфірамбы.

Гершовічы і Окуні спакойны, дакумант-фальшыўка у выглядзе выведу брыгады — падрыхтован.

А на самой справе, што ў гэты момант робіцца ў лячэбных установах?— Безгаспадарчасьць, самаснабжэньне, самапрэміраваньне, заціск самакрытыкі, падхалімства квітнеюць у лячэбных установах Бабруйску.

Цяжкія хворыя застаюцца бяз догляду, прадукты разбазарваюцца, прычым іншая доля прадуктаў попадае шовічу і яго прыцялелям.

Практыка работы лячэбных устаноў свае ўсе ўмовы для раскрадваньня. Чык стаўсяй «камуністка» Жура зьяўляецца адначасова касірам-кладаўшчыцай. Загадчыца Жуп[illegible] павінна кантраляваць кладаў-Жураўлёву. Напамінаем, што [illegible]ніца не для сьмячэньня штэ-[illegible]раўлёва за ўсе гэтыя пасады [illegible]ае асобную плату.

[illegible]чны санаторый прыстасоўваецца [illegible], растратчыкі. Дзяржаўныя гро[illegible]шы разбазарваюцца. Кулачка станавіцца ў попі сьвяшчэнца санаторыя. Па 4 руб. пасьцель ёй за пітр малака. У сьпісы ўдарнікаў заносяцца яўна чужыя людзі, з цёмным мінулым.

Клясавы вораг настолькі свабодна пачынае сябе адчуваць, што адкрыта пачынае весьці контр-рэвалюцыйную работу.

Усе гэтыя агіднасьці рабіліся на вачох раённых арганізацый, але іх доўга чамусьці не заўважалі.

Адзак, шыла ў мяшку ня ўтоіш. Аб гэтых агідносьцях ідуць гутаркі па гораду, [illegible] БЫ. Яго аб[illegible] нібыта зьяў[illegible] дзелчаў «не[illegible]ністычнай [illegible]

Румын.

ВЕНА, 28 [illegible] з БУХАРЭСТ [illegible] ўсёй краіне прыходзіць матар[illegible] валюцыйных [illegible] прыдушыць падрых[illegible] нага юнацкага дня. «Куды [illegible] дарне, што гэтымі дням[illegible] разгарнуте новая арганіз[illegible] IX БАР[illegible]ЗУ. Арыштаро[illegible] ўступае ў жы этап. Арганізоўва[illegible] змова супроць чысткі.

Окунь і Гершовіч у часе знаходжаньня ў весьці дзе[illegible] аб узаемным умоўчаньні сваіх памы[illegible] у часе чысткі, каб утаіць ад камісіі няўмы прарыў. Тут-жа бяруцца на ўлік члены партыі беспартыйныя, якія могуць ускрыць у ходзе чысткі усе агідносьці. Намячаецца плян іх апрацоўкі.

Сакратар ячэйкі Окунь бярэ на сябе ініцыятыву весьці пагаворы з членам партыі Ізгурам, з боку якога можна было чакаць выступленьня з выкрыцьцём усіх злачынстваў. Окунь у часе гутаркі з Ізгурам абяцае яму за маўчаньне на чыстцы кампэнсацыю ў відзе выступленьня, як сакратара ячэйкі, пры пэрсанальнай чыстцы Ізгура з аднакай аб заслугах Ізгура перад партыяй. Далей Окунь апрацоўвае групу беспартыйных, як сябе весьці на чыстцы.

Гершовіч таксама вядзе гутаркі з Ізгурам, угаварвае яго не выступаць з выкрыцьцямі на чыстцы.

Там, дзе Гершовічу не ўдаецца угаварыць, ён дзейнічае сілай сваёй улады. Падпачаткоўцу, члена партыі тав. Рэйнгольд, Гершовіч выклікае «для тлумачэньняў».

Бабруйская камісія па чыстцы ўскры па мануўр клясавага ворага. Выключыпа Гершовіча і Окуня, як ворагаў партыі. Назначыла паўторную чыстку ячэйкі. Дала належную палітычную ацэнку данай справе. Рэспубліканская камісія па чыстцы пацьвердзіла пастанову бабруйскай камісіі, завастрыла ўвагу ўсіх партыйных арганізацый на даны факт змовы супроць чысткі партыі.

Аднак, справа гэтым ня вычэрпваецца. Нашы партыйныя арганізацыі, у першую чаргу бабруйская, усе камісіі па чыстцы павінны вынесьці з гэтай справы поўны ўрок.

У нізоўнасьці маем яўнае арганізаванае супраціўленьне чыстцы партыі. Тут людзі ня толькі ўтойваюць ад партыі свой твар, ня толькі ня сумленны перад партыяй, мы маем арганізаванае выступленьне, каб сарваць чыстку.

Чыстка для іх карэньніца. Рушацца іх апошнія нарты, і яны парашылі добраахвотна ня здацца. У сваёй барацьбе супроць партыі яны не пагарджаюць [illegible] мэтадамі. Адных яны «апрацоўваюць», другіх запалохваюць, трэціх проста падкупляюць. Апіраюцца яны на ўсіх гнілых і разлажыўшыхся элемэнтаў унутры партыі.

Але нас у даным выпадку таксама цікавіць другі бок справы. Як магло здарыцца, што на працягу такога доўгага часу група ворагаў разьвальвала работу ў пекавых установах і, нарэшце, стала на шлях простай змовы супроць чысткі партыі.

Толькі таму, што ў партыйнай арганізацыі мэдсанпрацы была страчана клясавая пільнасьць, толькі таму, што крытыка і самакрытыка была ў загоне, толькі таму Гершовічы і Окуні маглі рабіць свае справы.

Адсюль вывад, што трэба мацней ударыць па зацісканчых самакрытыку, яшчэ больш разгарнуць крытыку і самакрытыку ў нашай рабоце, «УЗЬНЯЦЬ ПІЛЬНАСЬЦЬ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ, АБВАСТРЫЦЬ ЯЕ ЎВАГУ ДА НАШЫХ НЕДАХОПАЎ...» (СТАЛІН).

Камісіі па чыстцы павінны яшчэ глыбей увайсьці ва ўсе дэталі правяраемых арганізацый.

Пры пэрсанальнай праверцы членаў партыі трэба свае вывады рэбіць ня толькі на падставе выказваньняў на самым сходзе, а праверыць сапраўдную ролю кожнага члена партыі на сваім вучастку.

У чым палітычны сэнс данага выступленьня?

Клясавы вораг у адкрытай барацьбе разьбіт. «ВОРАГ ЗРАЗУМЕЎ ЗМЕНЕНУЮ АБСТАНОЎКУ, ЗРАЗУМЕЎ СІЛУ І МАГУТНАСЬЦЬ НОВАГА ЛАДУ У ВЁСЦЫ, І, ЗРАЗУМЕЎШЫ ГЭТА, ПЕРАБУДАВАЎСЯ, ЗЬМЯНІЎ СВАЮ ТАКТЫКУ — ПЕРАЙШОЎ АД ПРОСТАЙ АТАКІ СУПРОЦЬ КАЛГАСАЎ ДА РАБОТЫ ЦІХАЙ САПАЙ» (СТАЛІН).

Наперакор Гершовічам і Окуням рабочыя і калгасныя масы сустракаюць чыстку новым уздымам творчай актыўнасьці.

Гершовічы і Окуні выкрыты і выгнаны з радоў партыі, але такія, як Гершовіч яшчэ сям-там засталіся. Тым мацней павінен быць накіраван агонь супроць ворагаў партыі.

Вышэй рэвалюцыйную пільнасьць!

І. А. ЛЫЧОЎ.

Аб факце змовы супроць чысткі партыі з боку кіраўнікоў ячэек мэдыка-санітарных устаноў гор. Бабруйску

ПАСТАНОВА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

Заслухаўшы даклад Бабруйскай раённай камісіі па чыстцы і абмеркаваўшы пратакол аб'яднанага пасяджэньня раённай камісіі па чыстцы, бюро райкому і прэзыдыум кантрольнай камісіі аб змове супроць чысткі партыі з боку кіраўнікоў ячэек мэдыка-санітарных устаноў г. Бабруйску (больніцы і дыспансэру) у асобе сакратара ячэйкі дыспансэра Окуня, члена бюро ячэйкі больніцы, ён-жа загадчык райздрава — Гершовіча — рэспубліканская камісія пастанаўляе:

1. Ухвяліць раённае аб'яднанага пасяджэньня аб паўторнай чыстцы гэтых ячэек, а таксама аб выключэньні з партыі за змову супроць чысткі, накіраваную на ашуканства партыі, сакратара ячэйкі дыспансэру **Окуня** Давіда Нахаравіча, члена партыі з 1929 году, служачага і **Гершовіча** Мірона Барысавіча, члена партыі з 1927 году, служачага, загадчыка райздрава, члена бюро ячэйкі больніцы.

2. Прапанаваць бабруйскай раённай камісіі па чыстцы разгарнуць шырокую палітычную работу вакол гэтай пастановы, пераглядзець усю сваю работу па іншых ячэйках у разрэзе гэтага рашэньня, з пункту погляду разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі ва ўсёй бабруйскай арганізацыі; больш старанна выявіць заціскаючых самакрытыку, перарадзіць цаў і дзяўрушнікаў, як выяўленых у гэтай ячэйцы, а таксама і ў другіх ячэйках, зрываючых мерапрыемствы і выкананьне гарчовых задач партыі і ўраду.

3. Прапанаваць райкому партыі і РКК КІ(б)Б прывяць самы актыўны ўдзел у разгортваньні гэтай работы, шляхам абмеркаваньня гэтага пытаньня на сходах усіх ячэек, а таксама скліканьня актыву і асьвятленьня ў друку выявіўшайся антыпартыйнай работы у ячэйках дыспансэру і больніцы і ў іншых савецкіх ячэйках гораду.

4. Абавязаць раённую камісію па чыстцы інфармаваць рэспубліканскую камісію аб разгортваньні работы на аснове гэтай пастановы і аказаньня дапамогі з боку райкому партыі ў разгоце на чыстцы партарганізацыі.

5. Прапанаваць усім гар. і райкамісіям па чыстцы абмеркаваць раённае рэспубліканскай камісіі, райкому і бабруйскай камісіі па чыстцы на нарадах прадстаўнікоў і членаў ячэйковых камісій па чыстцы, а таксама на парт актывах—завастрэньні асаблівую ўвагу на выяўленьні антыпартыйных вылазак клясавых ворагаў з партбілетам у кішэні, даючы іх бальшавіцкі адпор, на аснове разгорнутай шырокай крытыкі і самакрытыкі.

І. А. Лычоў

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА ВЫЛАЗКАХ КЛЯСАВАГА ВОРАГА

Пралетарская рэвалюцыя, падрыхтаваная і праведзеная пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі бальшавікоў стварыла новыя магчымасьці разьвіцьця беларускай, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу, культуры. Толькі на ўмовах дыктатуры пралетарыяту стварэецца поўная магчымасьць росту і разьвіцьця культурнага і эканамічнага ўсяму ўсіх нацыянальных меншасьцяй. Гэтыя заваёвы Кастрычніцкай рэвалюцыі і гістарычныя посьпехі на фронце нацыянальна-эканамічнага будаўніцтва нельга разглядаць ізалавана ад агульных задач барацьбы за перамогу пралетарскай дыктатуры ў краіне Саветаў.

Партыя бальшавікоў дабілася гэтых посьпехаў на аснове «збліжэньня пралетарыяту і поўпралетарыяту розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы» (З праграмы УсеКП(б)). Таму посьпехі ў БССР ёсьць вынік бацкай ініцыятывы дапамогі пралетарыяту усяго Савецкага саюзу і гэтыя гістарычныя посьпехі нямінуча выклікалі і выклікаюць шалёнае супраціўленьне класавых ворагаў.

Разьбіты, але недабіты клясавы вораг — рэшткі капіталістычных клясаў, буржуазна-нацыяналістычная контр-рэвалюцыйная частка прыкрываючыся фальшывымі нацыянальнымі сьцягам, праводзіць свае падрыўную контр-рэвалюцыйную работу.

Характэрныя ў гэтых адносінах [illegible] справы Вузьдзенскага р-ну. Кіраўніцтва гэтага раёну не зрабіла для сябе практычных вываду з раішэньняў сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, на якім было адзначана, што «беларускім партыйным, савецкім, прафэсіянальным і камсамольскім арганізацыі по выдуць бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, і ў радзе выпадкаў натыкаюць буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям» (з пастановы пленуму). Кіраўніцтва раёну ня ўлічыла гэтых указаньняў пленуму і не мабілізавала ўвагу ўсёй арганізацыі на ўзмацненьне партыйнай пільнасьці—не паставіла справу так, каб «кожны камуніст у паасобку зразумеў сутнасьць скажэньняў і памылак у правядзеньні нацыянальнай палітыкі, каб сапраўды завастрыць бальшавіцкую пільнасьць, непрымірымасьць да нацыяналістычных кулацкіх вылазак» (з пастановы сакавіцкага пленуму).

І клясавы вораг, карыстаючыся апартуністычнай блыдзеньнасьцю РК і РККК у пытаньні рэалізацыі раішэньняў пленуму,—скрыта і адкрыта праводзіў ашыстасвецкую, контр-рэвалюцыйную работу.

Пад бокам райкому і РКК-РСІ рэшткі сіяністскай і бундаўскай арганізацыі Вузды сканцэнтравалі свае сілы у шпіёнскай арцелі «Кастрычнік» і арганізаваным парадкам рабілі сваю справу.

Для лепшасьці пытаньня нельга не спыніцца на складзе гэтай арцелі.

Арцель, арганізаваная яшчэ ў 1927-1928 годзе, з пачатку свайго існаваньня трымае ўнутры сябе моцна зработаную, яўна антысавецкую групу асоб — былых эксплёататараў, буйных гандляроў, ліпэнцаў, сярод якіх былі актыўныя бундаўцы і сіяністы. У прыводзіцца ці, з 49 членаў арцелі і 6 служачых—5 чал. членаў арцелі зьяўляюцца ў мінуламу мінулым буйнымі гаспадарамі-эксплёататарамі. Гэта Левін М., як да 1923 году меў уласную майстэрню з 2-3 наёмнымі рабочымі; Пікус Б.—да 1929 году меў уласную майстэрню з 3 сталымі рабочымі, а да рэвалюцыі 7-9 чал.; Грышпан С., які да 1925 году меў уласную майстэрню з 3-4 наёмнымі рабочымі; Ель Шая да 1927 г. эксплёатаваў у сваёй майстэрні 2-3 чал. Кантаровіч Д., меўшы да уступленьня ў арцель уласную майстэрню з наёмнай рабочай сілай.

Чатыры асобы ў нядаўнім мінулым буйныя гандляры, як Бэрштэйн Р. — займалася гандлем да 1928 г. і зараз на абаўлена выбарчых правоў; Халінская —дачка буйнага гандляра (да 1924 г.)— працуе бухгальтарам арцелі; Некрашсын гандляра (да 1928 г.)—рахункавод арцелі; Кац Вася—гандляр.

Гэта ядро, а калі ўлічыць, што халяй трыццаці членаў арцелі, апроч указаных, у мінулым так званыя «саматужныя дзіночкі», хоць і не выгадавалі чайму рабсілы дарослых) але-ж сыстэматычна эксплёатавалі вучняў,— то стане ясным, што гэтаму «асноўнаму» ядру была ўся магчымасьць мець трывалую базу ў правядзімай рабоце, мець заўсёды надзейнае падтрыманьне і дапамогу.

Стане больш ясная уся шкодніцкая работа, калі дабавіць, што сярод гэтай групы клясава-чужых элемэнтаў у арцелі працуюць Левін І і Грышпан—былыя актыўныя бундаўцы і што ў м-ку Вуэда да 1926-27 г. існавала моцная сіяністская арганізацыя з 10 асоб, рэшткі якой засталіся і зараз, у прыватнасьці Пікусе—сучасным сакратар парт'ячэйкі гэтае арцелі, а ў мінулым арганізатар сіяністкай арганізацыі моладзі ў гэтымжа мястэчку, дык становіцца відавочнай уся арганізаванасьць, сплачонасьць і «адзіны фронт» гэтай групы супроць мерапрыемстваў партыі на нацыянальным і гаспадарчым будаўніцтве. Камуністы зьявіліся і ня бачылі ў гэтым праяўленьня яўрэйскага шавінізму. Наглядзь не абмяжоўваліся клічкаю «гой». Клясавы вораг у асобе былых эксплёататараў, будаўцаў і сіяністаў адкрыта праводзіў сваю работу і ў працэсе вытворчасьці.

Звычайная тактыка—гэта расстаноўка сіл, і іменна гэта акалічнасьць была выкарыстана імі, як нельга лепш.

Усе вядучыя ўчасткі работы ў арцелі і спажывецкай кааперацыі знаходзіліся ў руках «былых людзей». Інструктары, закройнічыкі, вучот (бухгалтэрыя) у арцелі, базе, хлебапякарні, і вучот у кааперацыі былі выключна ўзначалены эксплёататарамі-гандлярамі і інш. (Шацкі—заг. базай, да 1927 г. меў смалакураны завод з 2-3 наёмнымі рабочымі, а ў сэзон 15-20 чал.; Райхман —заг. базай райзага, гандляр да 1928 г., плацёў падатку 700 руб.; Бэрштэйн—рахункавод, сын арандатара; Гімельштэйн — заг. плодагародніх-хавальні, гандляр на патэнту II разраду да 1928 году і г. д.).

Гэтая група, захапіўшы вядучыя участкі работы, не дапускала ні ў арцель, ні ў кааперацыю пралетарскі элемэнт на кваліфікаваную работу. Батрачка Махная Ліда цэлы год працавала ў арцелі на распоры старой адзежы з аплатай у 6 руб. у месяц. Крэсько Пётра 2 тыдні скарыстоўвалі на распоры старых кажухоў, і калі ён запрацэтаваў—яму быццам старшыня арцелі Бэрштэйн проста запіў: «Ваша справа—куды вам і трэба пайсьці».

Яўрэйскі шавінізм у нязўчасьці пры тым ня толькі ў тым, што абзывалі беларусаў «гой», а і ў тым, што ён выпірае ў працэсе самой вытворчасьці. І каб замаскаваць яго — паказаць, што ня толькі беларусам дасецца «чорная» работа — гэта група эксплёататараў, на чале з сакратаром парт'ячэйкі Пікусам (былым актыўным арганізатарам сіяністаў) побач з беларусамі ставілі і яўрэяў, і калі, напрыклад, гэтаму сакратару было пастаўлена пытаньне, што ў арцелі ня ўсё добра, што там яўны яўрэйскі шавінізм, Пікус не задумываў чысьці даказаў—калі ўгледжаць шавінізм у тым, што беларусам дасецца некваліфікаваная работа

12-ты дзень усебеларускай пераклічкі па сацспаборніцтве з Заходняй вобласьцю

ЗАМОЖНАСЬЦЬ ПРЫХОДЗІЦЬ НА ДВОР КАЛГАСЬНІКА

„...І калі мы будзем працаваць сумленна, працаваць на сябе, на свае калгасы, дык мы даб'емся таго, што ў якія-небудзь 2-3 гады ўзьнімем усіх калгасьнікаў-і былых беднякоў і былых сераднякоў да ўзроўню заможных, да ўзроўню людзей, якія карыстаюцца багацьцем прадуктаў і вядуць зусім культурнае жыцьцё“

(СТАЛІН)

Новым шляхам да новага жыцьця

Перад сьлепымі акенцамі Міруковай хаты расьлі некалі два ясяны. Дрэвы гэтыя сталь яшчэ і цяпер, але хата павярнулася да іх тылам, а сьветлымі новымі вокнамі—на поўдзень да сонца... І сталася гэта зусім нечакана, якраз праз два гады пасьля таго, як Мікола Мірук уступіў у калгас.

Так, прыпажсі, расцэньвалі гэтую праяву суседзі, бо новая хата была сапраўдна відавочнаю перамечаю ў Міруковым жыцьці, тым часам як больш дробныя зьмены, якія пачаліся з першага дня ўступленьня ў калгас, зьнікалі ў людзкой памяці бясьсьледна. Пра іх толькі дзень—два гаманілі каля калодзежу жанчыны, бяручы ваду:

— Чула суседка? Мікола Мірук купіў сваёй Агапе аж дзьве пары чаравік.

— Што ты кажаш?—дзівілася жанчына. Відаць, разбагацеў чалавек у калгасе.

— А чаму яму не разбагацець, калі яго доля гожая,—адказвала суседка.

1. АБ ДОЛІ—НЯГОДНІЦЫ...

Тым часам «гожая» доля Міколы Мірука была да калгасу гэтакая-ж нягодніца, як і доля кожнага селяніна, у каторага не было ні кала, ні двара, акроч вузенькай палоскі бацькаўскай зямлі, спустошанай і неаранай ужо некалькі год.

Хто-ж не мог араць? Міколу іншоў усяго дзевяты год, як памёр яго бацька і маці выйшла замуж за другога з гэтакай-жа нядатнай доляй і кучай малых дзяцей. Хлапчук мусіў здабываць сабе хлеб сваімі рукамі і застаўся ў фальчара Дзяткова за парабчука. Пазьней ён за тры рублі на год пасьвіў каровы ў кулака, а яшчэ пазьней працаваў сем год у пана Дзеньдзявіцкага за сталага парабка.

Так прайшлі Міруковы гады да прыгону, а на царскай службе захапіла яго японская вайна. Як вярнуўся ў 1906 годзе з фронту, ня было за што рук зашыць—стаяла ў глухім завулку старэнькая крывабокая хатка ды ляжала дзесьці аблогам абчышчаная з усіх бакоў сугрэшнямі вуліцамі палоска пяшчанай зямлі.

На гэтай бацькаўскай спадчыне капрабаваў Мірук будаваць гаспадарку. Адкасіў пану 10 маргоў сенажаці, пазычыў у яго на лета каня і пачаў луціць плавіну. Але не зацвілелі першыя ўзбраныя гоні, як грым пушка новая вайна, і Мірук, пакінуўшы жонку і двое дзяцей, ішоў пайшоў ваяваць за «бацькаўшчыну», ка торай ня меў. Вярнуўся ён да хаты аж у 1919 годзе, прынёсшы з нямецкага палону люльку, гарбатыя плечы і некаторую спрактыкаванасьць у агародніцкай справе, якую набыў па вялізарных агародах нейкага саксонскага графа.

За гады пасьля рэвалюцыі Мірук узьбіўся быў крыху на сваю гаспадарку, аднак, ні на каліва не памяншалася штодзённых турбот і падкучлівага клопату. Тады, разам з ростам калектывізацыі ў 1930 годзе, вырасла ў яго цьвёрдае жаданьне зьмяніць сваю вузкую і нярэстую сьцежку на шырокі грамадзкі шлях. Гэты шлях ёсьць адзіна правільны, бо партыя Леніна-Сталіна вядзе шырэзныя працоўныя масы да лепшага жыцьця.

2. І ЗЬМЕНАХ У МІРУКОВЫМ ЖЫЦЬЦІ

Менавіта з гэтага часу пачаліся зьмены ў Міруковым жыцьці. Аднойчы пеяк у зімовы вечар, калі ў хаце сабралася ўся сям'я, дзедаўская хата, якая дагэтуль здавалася прасторнай, чыстаю і сьветлаю, стала раптам цеснаю, брудзаю і цёмнаю. Над падлогі пахла кісьлым цестам, окраю гнілою глінаю і цьвілью.

— На ліха вы сьвінчо ў хату пускаеце? крыкнуў стары Мірук на жонку.

— А дзе-ж яго дзець?—агрызнулася тая.

— У хлеў!

— А вы добры хлеў зрабеце раней,—сказала з дакорам нявестка.

— Зрабеце!—перадразніў Мірук. Ён хацеў ужо, як некалі проста па інэрцыі, спасланца на вечную пястачу хлеба і грошай, але схамянуўся: у калгасным сьвірні ляжала наўтараста пудоў зробленага збожжа. Пры такіх росурсах сапраўды можна надумаць пра цёплы хляўчук для падсінка, а то і проста пра новую хату. Але гэтую апошнюю, занадта сьмелую вядзку, давялося пакуль што адкласьці: стаяла лютая зіма, меншыя хлопцы хадзілі бяз цёплай вопраткі і, у першую чаргу, трэба было набыць кажухі. Адным словам, пакуль што хата засталася старая, аднак, дужа пра новую ня выходзіла ў Мірука з галавы. Яна з цягам часу набывала [illegible] і ўсё больш выразныя больш [illegible]

3. КРОК НА ШЛЯХ ДА ЗАМОЖНАСЬЦІ

На працягу ўсяго мінулага лета Мірукі выхадзілі на працу штодзенна ў пецярых і рабілі старанна і дружна. Сам стары за добры дагляд агароду, з якога калгас меў 10.000 р. прыбытку, атрымаў 100 рубл. прэміі. Ня дрэнна працавала і ўся яго сям'я. У выніку гэтага пасьля разьмеркаваньня ўраджаю на долю Мірука прыпала 120 пудоў жыта, 45 пуд. ячменю, 25 аўса і 500 бульбы. Гэта ўжо быў вялікі крок па шляху заможнага жыцьця.

І вось настала апошняя часіна гнілой, крывабокай хатцы, у каторай замест падлогі, быў брудны і гразкі ток, у каторай пад палом неза конна кватэраваў падсьвінак, у каторую ніколі не заглядвала сонца, перад маленькімі акенцамі каторай самотна стаялі два высокія ясяны. Замест гэтай хаціны, стала новая — сьветлая, вокнамі на поўдзень, разьбітая на дзьве каморкі з кухняю, высланая гладкаю дашчанаю падлогаю, абклееная калыровымі шпалерамі. На вокнах зьявіліся тонкія паркалёвыя фіранкі, а на падаконьніках—кучастыя, з шырокім лістам і з ружовымі аганькамі кветак вазоны.

У новай хаце пашло маладое жыцьцё. Папрыходзіўшы з работы, перад вячэраю хлопцы жартавалі з малога Колі, апавядалі пра сьмешныя здарэньні, а часта заводзілі спрэчкі і па палітычныя тэмы. Пачыналася гэта звычайна так.

Старэйшы сын Валодзя, які нядаўна дэмабілізаваўся з Чырвонай арміі, разгортваў на стале «Чырвонаармейскую праўду» і, чытаючы яе, сам са бе нездаволена матаў галавой:

— А!.. думай ты... от шэльмы!

— Па каго ты?—ня мог, каб не папытацца стары Мірук, які пільна сачыў за сынам.

На японцаў!.. да вайны рыхтуюцца гады.

— Вайны ня будзе,—упэўнена адказваў малодшы. Яўген,—мы ні чыёй зямлі ня хочам...

— Ты ня хочаш. — Не давай яму дагаварыць Валодзя. — Так то яны цябе гэтыя буржуі і паслухаюць...

— Не паслухаюць, дык пабаяцца,—дамагаўся свайго Яўген.

— Дурань ты,—гарачыўся тады Валодзя. — Капіталістам няма дзе больш дзецца... І ён разьвіваў малюнак крызісу ў капіталістычных краінах, гаварыў, чытаў на галоце, што капіталісты будуць шукаць выйсьці з гэтага крызісу ў вайне з СССР.

Стары Мірук, выхкаючы люлькаю, моўчкі слухаў гэтыя гаворкі, аж пакуль не падавалі вячэру.

— Ну, досыць, абодвы вы нічога ня ведаеце,—гаварыў ён тады, ні то задаволены сынамі, ні то пакрыўджаны, што сам ён мала разьбіраецца ў гэтых пытаньнях і па яго не зьвяртаюць увагі.

4. ВЕСТКА АБЛЯЦЕЛА ЎВЕСЬ КАЛГАС...

Пасьля вячэры, калі сыны і нявестка, паапраўшы новыя польты, паабуваўшы хромавыя наваксаваныя чаравікі, разыходзіліся хто да суседзяў, хто ў чытальню, а хто на вечарынку—Мірук садзіўся за стол, сядлаў нос акулярамі ў медпаў аправе, і чытаў «Чырвонаармейскую праўду». Імкненьня набыць больш ведаў заставіла Мірука выпісаць яшчэ адну газэту «Зьвязду».

Гэтая вестка, што Мірукі выпісваюць аж дзьве газэты, хутка абляцела ўвесь калгас. Мірук узяў рэкордную вышыню палёту—у яго была новая хата, дзеці японыя хадзілі апранутыя ў гарадзкія польты, сам ён чытаў аж дзьве газэты.

Вярнуўшыся, цяпер Мірук іншоў першым, у кампаніі трымаўся сьмела, а дома нават выхваляўся трохі і заліпце.

— Агапа!—гукаў ён на жонку, вярнуўшыся з работы,—дзе ты ўжо маю «Зьвязду» дзела? От неразумная баба, сьвежую газэту недзе закінула.

Між тым, «Зьвязда» ляжала на стале, Мірук яе добра бачыў, і гаманіў на жонку толькі для таго, каб зьвярнуць увагу прысутных, што ён зьбіраецца чытаць «Зьвязду».

Але поўзабаве Мірукова слава крыху пашкодзіла. Стала пеяк усім вядома, што Павал Стралкоўскі выпісвае ажно тры газэты—«Зьвязду», «Камсамольскую праўду» і «Большавік Барысаўшчыны».

5. „ЦІ СЮДЫ Я ТРАПІЎ“

Гэта было ўжо сёлета перад жнівом. І от стары Мірук наважыў аднойчы прайсьціся да Паўла Стралкоўскага, у якога ён быў, як толькі той адно што пераехаў у калгас. Мірук памятае, што наважна жыў Стралкоўскі ў сваіх стралкоўцаў.

Зямлі было паўтара гэктара, гаспадарка ляцашная, даводзілася і самому батрачыць і дзяцей аддаваць у найміты.

Прыехаўшы ў 1927 годзе ў калгас «Чырвоная зорка», Стралкоўскі пасяліўся ў бруднай і вялізнай як адрына хаце, перароблена з былога панскага куратніку. Нікага абсталяваньня ў Стралкоўскага тады ў хаце ня было. Мірук добра ўсё гэта памятае і заходзіць у хату, як у даў по знаёмую. Але пераступіўшы парог, Мірук спыняецца ў нерашучасьці, па твары яго зьяўляецца непаразуменьне:

— Ці сюды я трапіў?—у голас пытаецца ён сам у сябе.

— А куды табе трэба?—сьмяецца здаровы, абросты густою барадою Павал Стралкоўскі, высунуўшы галаву з спальні.—Заходзь, чаго там?—запрашае ён госьця ў чысты пакой.

— Хата ў цябе неяк зьмянілася,—гаворыць Мірук, ідучы за гаспадаром у чысты пакой. Там каля дашчанай пераборкі, у кутку паўкасы стаіць пісьмовы стол, а крыху далей шафа; ўсё гэта—новенькае, пакрытае чорным лякам. Вужкія і высокія дзьверы з гэтага пакою на кухню завешаны квяцістаю фіранкаю, жалезны ложак з вікілёвымі пераборкамі, зьсланы ўзорнаю саматканаю коўдраю, на ім ляжыць горка белых падушак. Са сьцен, абклеесных сінімі шпалерамі, паглядаюць правадыры. На стале ляжаць газэты і нейкія паперы, відаць, запісы працадзён, бо сын Стралкоўскага—брыгадзір.

— Хата ў цябе неяк зьмянілася,—гаворыць Мірук, сядаючы на новенькае венскае крэсла, якіх у пакоі тры.—Пабагацеў ты, мусіць, Паўла.

— А ты не пабагацеў хіба?—дзівіцца Стралкоўскі.—Усе пабагацелі.

Мірук пра гэта раней на думаў. І вось ён прыгадаў сваё ранейшае жыцьцё, і цяперашнае, прыгадаў адзі покую бесхацінную Фрэйду, якая яго на раней галадала, а цяпер мае хлеб і грошы і карову, прыгадаў былога парабка Кругліка, які вырас у калгасьніка, стаў членам партыі і намесьнікам старшыні праўленьня, прыгадаў усіх сваіх суседзяў—калгасьнікаў і зьдзівіўся:

— Сапраўды пабагацелі людзі, а я неяк не заўважаў.

— Пры добрым жыцьці і гора хутка забываецца,—адказвае Стралкоўскі і паказвае суседу набыткі—суконныя гарнітуры, хромавыя боты, ватовыя куртці, чаравікі, галёшы...

6. АБ КАРОВАХ І КНІЗЕ

— Усё гэта, брат, з леташняга ўраджаю яшчэ куплена. Ня думай, я мала менш за цябе зарабіў. Дзевяноста адзін пуд аднаго жыта атрымаў, а сёлета думаю і больш прыдзецца, ураджай важнецкі ўдаўся.

— Вялікі ўраджай,—няма ведама, што за яго і купляць,—таворыць Мірук, каб дазнацца, якія меркаваньні ў суседа.

— Трэба жывёлы падкупіць. Улада ідзе насустрач нашаму брату—калгасьніку, дык чаго там.

Стралкоўскі прышоў у калгас без каровы, бяз сьвіньні, бяз курыцы. За гэтыя гады ён набыў усё.

Праўду, суседзе, кажаш.

Гаворку перабіваюць малодшыя хлапцы Стралкоўскага. Яны абодвы перайшлі ў шостую групу ў сямігодцы і падаўна вярнуліся да сходу ў школе.

— Ты адно і думаеш пра карову, а нам кнігі патрэбны, вучыцца трэба.

— Можна і без навукі, мяне от ніхто ня вучыў, а я лепшым калгасьнікам,—жартуе Стралкоўскі.

— А газэты просіш, каб пачыталі, ага!—зларадасна пацішаецца сярэдні сын Валодзя.

— Маўчы! крыўдзіцца бацька, саромеючыся сваіх жартаў.—І пажартаваць нельга, быццам у мяне рубля ня будзе табе на кнігі.

І Стралкоўскі прызнаецца Міруку, што грошай ягоных у калгасе яшчэ ляжыць 700 рублёў, ды яшчэ будзе ад новага разьмеркаваньня, так што хопіць па ўсе выдаткі, тым больш на кнігі.

— А дзяцей трэба вучыць,—пераканальна гаворыць ён Міруку, калі той выходзіць ужо з хаты.

Мірук згадваецца і пазьней, праходзячы каля сямігодкі, былога панскага дому, ён прыгадвае, як яму самому хацелася [illegible] чыцца, ды ня было [illegible] сваіх мала вучыў, дакуль [illegible] ён—ня было за што вучыць, [illegible] ня крыўдуюць. От хіба ўжо Ко[illegible] мага меншага яшчэ, пакай [illegible] навукі пройдзе.

Яго доля шчасьлівая, багатая доля. Усе калгасьнікі пабагацелі,—успаміная ён словы Стралкоўскага і з узгорку перад сваёю хатаю аглядае шырачэзныя аблітыя месячным сьвятлом калгасныя жытнія панары, дзе праз год будзе каласіцца калектыўная праца і яшчэ лепшы дабрабыт.

П. Бродка, П. Глебка

Калгас «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА», БАРЫСАЎСКІ раён.

Фота-мантаж Вал. МЯДЗЬВЕДЗЕВА.

АГЛЯД ДРУКУ

РАСКАЖЭЦЕ ПРА ВАГУ ПРАЦАДНЯ

„КАЛГАСЬНІК УЗЬДЗЕНШЧЫНЫ“—УЗДА, „БАРАЦЬБІТ ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ“—ПЛЕШЧАНІЦЫ

Справа была ў калгасе «Перамога» Сямёнаўскага сельсавету (Уэда). Старшыня калгасу Ліцюк арганізаваў кулак кае разбазарваньне працадзён. Ён выпісаў 5 працадзён крамніку Шавелю **У АБМЕН НА СЕЛЯДЦЫ.** Ён па сваёй уласнай ініцыятыве пісаў распараджэньні брыгадзіру Рамачэнку аб налічэньні Махначу — 2,5, а С і М. Барбарчыкам па 1,5 працадні. Услед за старшынёй працадзнямі гандлююць (у поўным сэнсе гэтага слова) і асобныя калгасьнікі.

Аб гэтых фактах кулацкага разбазарваньня працадзён «Калгасьнік Узьдзеншчыны» даведаўся толькі 16 жніўня — праз 6 дзён пасьля зьмяшчэньня аб гэтым артыкулу ў рэспубліканскай прэсе. Факт, які красамоўна паказвае наколькі слабая зьвязка газэты з масамі, наколькі **ДРЭННА ВЕДАЕ** рэдакцыя пра [illegible]

[illegible] ня выкліканае. Праўда, ня [illegible] было, каб яшчэ дзе-небудзь «купілі» селядцы за працадні, але на словах самой газэты:

«У абмен калгасе Пелякоўскага сельсавету (цікава: газэта нават не назвала, у якім — рэд.) дадумаліся разбазараць працадні калгасьнікаў **У АБМЕН ЗА ГНІЛЫ АМБАР, ЗА ЯКІ ЗАПЛОЧАНА 30 ПРАЦАДЗЁН».**

«Калгасьнік Узьдзеншчыны» аказаўся нездольным даць правільную ацэнку справе. Газэта **БЛЫТАЕ.**

«Гэты мапэўр клясавага ворага накіраваны на падрыў дырэктыў партыі аб стройнім **РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ** працадзён сярод калгасьнікаў».

НЯПРАВІЛЬНА. Працадні не разьмяркоўваюцца, а зарабляюцца калгасьнікамі, а гэты мапэўр накіраваны на **АБЕСЦАНЕНЬНЕ** і разбазарваньне працадзён, на развал калгасу.

Нават з фіксацыі гэтых фактаў газэта не зрабіла для сябе апошніх высноваў. Яна не ўзьняла ярасьці калгасных мас супроць ліцюкоўскіх махінацый. Рэдакцыя не скарыстала гэтых фактаў, каб на простай, зразумелай для ўсіх калгасьнікаў, мове, расказаць, што такое працадзень, як яго можна зарабіць і што на яго атрымае добрасумленны калгасьнік.

20 жніўня «Калгасьнік Узьдзеншчыны» зьмяшчае вялікі артыкул пад загалоўкам «Выдаваць авансы толькі па працадзёх». Артыкул — **АГУЛЬНЫ.** У ім ні слова аб канкрэтных у раёне фактах [illegible] разбазарваньня першага [illegible] Артыкул не закрануты [illegible] разбазарваньня працадзён.

Газэта **МАЎЧЫЦЬ...**

* *

«БАРАЦЬБІТ ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ» назагтае ўспамінае аб [illegible] працадзён. Ні слова аб працаднёх, ні слова аб аважаваньні — такі ўжо стыль у плешчаніцкай газэты. А магчымасьці ў руках рэдакцыі вялікія.

Узяць хоць-бы артыкул «Ісправіцы на ўборцы». Калгас ударна ўбіраў, калгас поўнасьцю выканаў абавязацельствы па жыту. У калгасе няма прагулаў. 20 жніўня з «Іскры» буксіравалі адстаўшую камбайну «1 май». Дзеці і старыя жанчыны зьбіралі каласы.

Па словах самой газэты:

«Збор калосься даў у калгасны сьвірэн 855 кілё збожжа».

Але, чаму-ж «Барацьбіт за калектывізацыю» не расказаў усяму раёну, колькі і чаго атрымаюць калгасьнікі на працадзень і як павышана яго вага добрасумленнай работай саміх калгасьнікаў?

* *

І узьдзенская і плешчаніцкая газэты ня выкакалі надзвычай важнай дырэктывы пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, які абавязаў:

«РК, РВК і начпалітаддзелы забясьпечыць, каб не пазьней 5 жніўня на ўсіх калгасах былі складзены [illegible] разьмеркаваньня ўраджаю».

Гэтага таксама не зрабілі ўзьдзенскі плешчаніцкі рашэсы і райкомы.

Напярэдадні падзелу разьмеркаваньня ўраджаю трэба яшчэ больш пасьціць асобістую вашкаўдзенасьць кожнага калгасьніка ў лепшым правядзеньні ўборкі, у дагарэмовай і высокажакаснай збожжасушцы.

Трэба рашуча змагацца супроць кулацкай ураўніліўкі, супроць разбазарваньня працадзён

КАЛГАСЬНІКУ ГАЗЭТА АБАВЯЗАНА РАСКАЗАЦЬ, КОЛЬКІ ЁН АТРЫМАЕ НА ПРАЦАДЗЕНЬ.

І. ШУСТЭР

Брыгадзір калгасу „Чырвоная вясна“, Случчына

УРАДЖАЙ УЗНАГАРОДЗІЎ ЗА СУМЛЕННУЮ ПРАЦУ

Наша брыгада № 1 спаборнічала з брыгадай № 2. Спаборнічалі таксама паасобныя зьвеньні. Дружна, з уздымам працавалі калгасьнікі. Выходзілі ў поле ў 5 гадзін раніцы, канчалі ў 10 гадзін вечара.

Уборку азімых скончылі за 7 дзён — зжалі 20 га. З 11 па 7 жніўня ўбіралі яравыя — скончылі ў тэрмін, раней іншых брыгад.

Кожны калгасьнік добра ўсьвядоміў, што ён змагаецца за заможнае жыцьцё, і таму не дапускаў ніякіх спазьненьняў і прагулаў. Ва многім дапамагла нам партыйная лязёнка, дзякуючы яе кіраўніцтву мы правільна расставілі сілы на вучастках.

Кожны з нас сачыў за якасьцю работы. Падлеткі зьбіралі каласы, поле засталося чыстым. Разам з уборкай праводзілі і пастаўкі. Нормы малацьбы перавыкананы. Не 130, а 150-160 пудоў абмалочвалі штодня.

20 ЖНІЎНЯ МЫ КАНЧАТКОВА РАЗЬЛІЧЫЛІСЯ З ДЗЯРЖАВАЙ — ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛІ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАПАСТАВАК. Засталося здаць бульбу. Прыёмшчыкі хвалілі наша збожжа: «Вось якую прадукцыю трэба здаваць». За ўдарную работу прэміяваны Іван Ісака, Юстын Карцель, Янка Губчык, Маня Верамейчык і інш.

У мінулым годзе мы атрымалі на працадзень валя 3 кгр. збожжа і 5 бульбы, а ў гэтым годзе працадзень дае звыш 5 кгр. збожжа і 13 кг. бульбы. Кожны гэктар азімых даў 12,5 цэнтнэраў ураджаю.

ЛАЗАРЧУК, МАТУСЭВІЧ

Амельнаўскі сельсавет, Смалявіцкага раёну

ТЭМПЫ ПАМНОЖАНЫ НА ЯКАСЬЦЬ

У гэтым годзе, як ніколі, увага калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў прыкавана да якасьці работы і аховы ўраджаю. Машыны, як правіла, працавалі з зерняўлоўнікамі, каласы пасьля жніва і возкі спаноў акуратна зьбіраліся. У калгасе «Перамога» вязальшчыцы так чыста ўбіралі збожжа, што пасьля іх ня трэба было другі раз зьбіраць. У радзе калгасаў і вёсак працавалі інспэкцыі па якасьці.

Сёлета мы ўпяршыню арганізавалі абмалот на аднаасобным сэктары. Вылучаныя адказныя ўпаўнаважаныя на кожную дзесяцідворку. Узяты па ўлік усе малатарні ў аднаасобным сэктары, да якіх прымацаваны паасобныя гаспадаркі.

Факты паказваюць, што ахова ўраджаю зьяўляецца важнейшым зьяваном работы. Вартаўнік калгасу «Перамога» злавіў зладзея Кісьляка, які зжаў 10 кгр. каласоў калгаснага жыта. Такі-ж факт меў месца ў калгасе «Чырвоны змагар».

Яшчэ да 10 жніўня ўбралі і зьвезьлі ўсё жыта. Два дні назад скончылі ўборку ячменю.

Сельсавет поўнасьцю выканаў гадавы плян паставак жыта.

Калгасьнікі ў часе ўборкі працавалі без выхадных дзён і адмовіліся ад рэлігійных сьвят. Калгасьнік-ударнік Скуратовіч, якому 50 год, заявіў: «Бог нам збожжа не ўбярэ». І пашоў працаваць у сьвяточным дні.

У нашым сельсавеце бульба і іншыя культуры пасеяны на тарфяным угнаеньні. Ужо відаць, што ўраджай вельмі добры, ён абвяргае кулацкую агітацыю супроць ужываньня торфу.

Апошняя пастанова партыі і ўраду аб падзяленьні калгасьнікаў каровамі яшчэ больш узьняла творчую актыўнасьць калгасных мас. У калгасе «Перамога», дзе гадуецца 37 цёлак, мяркуюць аддаць бескарэўным калгасьнікам значную колькасьць жывёлы. Калгасьніку Плісоўскаму, які ніколі ў жыцьці ня меў карову, ужо зараз ёсьць цёлка.

Я. МАРОЗАЎ

Старшыня калгасу „Чырвоны герой“, Крупскага раёну

НАШ УКЛАД У САЦСПАБОРНІЦТВА

Усе 200 га ярыны мы засеялі ў звышранійя тэрміны і добраякасна. Гэтаму значна дапамагло шырокае растлумачэньне прамовы нашага правадыра тав. **Сталіна** па ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў. Мы па-бальшавіцку патрыхтавалі высокі ўраджай.

Зараз мы пажынаем плёны ўдарнай працы на палёх. Ураджай сабралі бяз страт і да 24 жніўня выканалі гадавы плян збожжапаставак на 65 проц. Вясной мы засеялі поўгэктара ў фонд абароны, зараз здалі ў гэты фонд 400 кгр. збожжа.

За атрыманьнем авансу прыходзяць да нас пераважна новыя калгасьнікі, якія ў гэтым годзе ўступілі ў калгас у часе веснавой сяўбы. У большасьці старых калгасьнікаў і зараз яшчэ ёсьць леташні хлеб. Вось, Максім Камароў. У 1932 годзе ён разам з сям'ёй выпрацаваў 640 працадзён, а за 7 месяцаў гэтага году ён ужо мае 456 працадзён; а да канцатоду ў яго працоўную кніжку будзе запісана ня менш 700.

Наша гаспадарка займаецца ня толькі паляводзтвам. Мы маем малочную ферму з 20 кароў і 26 галоў маладняка. Да 20 жніўня здалі дзяржаве 6.170 літраў. Выканалі і плян мясапаставак.

Вялікае будаўніцтва разгарнулася ў калгасе. Калгас складаецца з двух вёсак. Раней імі ніколі ня было добрай дарогі. Сялянскія калёсы проста тапулі ў гразі. У гэтым годзе нашы калгасьнікі ўласнымі сіламі пабудавалі дарогу і злучылі абедзьве вёскі ў адну гаспадарку. Будуем мы вялікі сьвінарнік, сенавал, стайню.

— Гэты год будзе зусім сыты — гавораць калгасьнікі.

А як жылі яны раней? Кавалак зямлі ў некалькі сажняў, ды работа да поту на памешчыцкай зямлі. Прыйшлося было працаваць на пана, інакш з голаду ногі працягнеш.

Будуць заможнымі тыя калгасьнікі, якія працавалі сумленна.

Нашы ўдарнікі сёлета атрымаюць збожжа ў некалькі разоў больш, чым летась. Вось, возьмем **Максіма Камарова.** Летась атрымаў ён збожжа 70 пудоў, сёлета 73. Ячменю ён раней атрымаў — 29, сёлета — 60. Бульбы атрымае 800 пуд., а можа і больш, замест 456. Аўса летась не далі, а сёлета атрымае 400 кгр. А такіх як Камароў у нас многа. І Пятро Лыба і Рыгор Аўцюшкоў і Грыбоўскі Кастусь. Ніколі яны ня марылі атрымаць столькі прадуктаў. Заможнасьць уваходзіць у калгасны двор.

Ахрэм Шыкалаў

Старшыня калгасу „Верны шлях“, Затонскага с. с., Жлобіншчына

ЗМАГАЛІСЯ СА СТРАТАМІ, ЯК НІКОЛІ

СПАЛУЧАЎШЫ МЭХАНІЗАВАНУЮ ЎБОРКУ З РУЧНОЙ, МЫ ДА 17 ЖНІЎНЯ СПРАВІЛІСЯ З УБОРКАЙ АЗІМЫХ І ЯРАВЫХ КУЛЬТУР. КАЛГАСЬНІКІ І ЎНАЧЫ ПРАЦАВАЛІ НА ПОЛІ, КАБ ТОЛЬКІ ЗЬВЕЗЬЦІ ЗБОЖЖА СУХІМ.

АДНО ЗЬВЯПО. АДНА БРЫГАДА СПАБОРНІЧАЛА З ДРУГОЙ. ШТОДЗЕННА ПАСЬЛЯ РАБОТЫ БРЫГАДЗІР І ЗЬВЕНЬНЯВЫЯ ПРАВЯРАЛІ ЯКАСЬЦЬ ПРАЦЫ. НА ПОЛІ ПРАЦАВАЛІ БРАКЕРАЖНЫЯ КАМІСІІ ДЛЯ АЦЭНКІ ЯКАСЬЦІ ЎБОРКІ. БЫЎ АРГАНІЗАВАН ЎЗАЕМНЫ КАНТРОЛЬ ПРАЦЫ З КАЛГАСАМ «ЧЫРВОНЫЯ ГОРКІ». КАЛАСЫ ПАДГРАБАЛІСЯ РУЧНЫМІ ГРАБЛЯМІ І ПАДБІРАЛІСЯ ПАДЛЕТКАМІ.

СНАПЫ ВАЗІЛІ ТОЛЬКІ НА КАЛЁСАХ СА ПЧЫЛЬНЫМІ ДРАБІНКАМІ, АБО З РАЗАСЛАНЫМІ ПАДСЬЦІЛКАМІ. ІНСПЭКТАРЫ ЯКАСЬЦІ МАТРУНА ЖУКАВА І МАР'Я ПЛЕЦЯЖАВА ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ГОНАРАМ КАЛГАСУ. ЯНЫ ЗЖЫНАЛІ АД 0,17 ДА 0,24 ГА Ў ДЗЕНЬ ЗАМЕСТ НОРМЫ Ў 0,11. ДЛЯ АБМАЛОТУ ЗБОЖЖА БЫЛА ВЫЛУЧАНА БРЫГАДА З ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ-КАЛГАСЬНІКАЎ.

НА 22 ЖНІЎНЯ КАЛГАС ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН ПА ЎСІХ ЗБОЖЖАВЫХ.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЎРАДЖАЙ ДОБРА АБЛЮЧВАЕ СУМЛЕННУЮ ПРАЦУ КАЛГАСЬНІКАЎ. СІМ'Я МАРКІ МАРКАЎЦОВА. НАПРЫКЛАД. АТРЫМАЕ ДА 150 ПУДОЎ ЗБОЖЖАВЫХ І 750 ПУДОЎ БУЛЬБЫ.

У БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Саўгас імя Дзесяцігодзьдзя БССР—адзін з саўгасаў, які працуе на мэліяраваным балоце. З году ў год пашыраецца плошча, балота ўступае свае абшары, мацнее гаспадарка.

У саўгасе працуе добра абсталяваны завод па першапачатковай апрацоўцы канапель, ёсьць сная электрастанцыя ,вузкакалейка, пабудован рабочы пасёлак.

Пасеўная плошча саўгасу зараз складае 2.180 га, з якіх 700 гэктараў канапель, больш 400 збожжавых.

Саўгас вышаў пераможцам у барацьбе за бальшавіцкую сяўбу і атрымаў вясной гэтага году прэмію за ўдарную работу. У саўгасе ўжо скончана ўборка ячменю і жыта, канчаецца жніва аўса, канапель. Разгарнулася сяўба азімых.

Гэтымі посьпехамі саўгас па многім абавязан дырэктару тав. **Гудкову,** які ўстанавіў цьвёрдую бальшавіцкую дысцыпліну, ліквідаваў бесадказнасьць і абязьлічку ў рабоце. Ударнікі саўгасу карыстаюцца пераважным снабжэньнем і харчаваньнем у сталоўцы.

Дзякуючы высокай якасьці ворыва і сяўбы і ўкараненьню агра-тэхнічных мерапрыемстваў, саўгас дабіўся высокіх ураджаяў.

Ураджай аўса на паасобных вучастках складае да 18-25 цэнт. з га.

Ураджай быў-бы значна меншым, калі-б пры ўборцы не змагаліся са стратамі. Уборка праводзілася пад асноўную задачу—здаць таварную прадукцыю дзяржаве.

Трэба адзначыць тыя тормазы, якія перашкаджаюць рабоце. У гаспадарцы лічыцца каля 2,5 тысяч га асушнага балота. Яно павінна засявацца сіласна-тэхнічнымі культурамі, у першую чаргу канопляй. Фактычна годнай асушанай плошчы для севазвароту ёсьць ня больш 1.000 га, рэшта «фуксам» залічана ў асушаную.

Наркамзем і Поўлубтрэст павінны дапамагчы саўгасу ў мэліярацыі балот, бо інакш нельга выканаць базавую задачу—пашырыць пасеўную плошчу пад канопляй у другой пяцігодцы да 2.700 га.

С. Л.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

КАМСАМОЛ ФРАНЦЫІ АНТЫЮНА РЫХТУЕЦЦА ДА XIX МЮД'У

ПАРЫЖ, 30. (Белта). Падрыхтоўка да мічнароднага юнацкага дня праходзіць во Францыі посьпяхова. Кожны тыдзень арганізуецца кангрэсу моладзі адзначае далучэньне да руху новых чатырох-пяці тысяч чалавек. Больш 60 проц. удзельнікаў руху — рабочая моладзь. На месцах створана 150 ініцыятыўных груп. На буйных прадпрыемствах створана каля. 12 камітэтаў. Арганізатэт атрымаў з Нансі заяву групы 200 салдат аб жаданьні прыняць удзел у антыюаенным кангрэсе.

СТАНОВІШЧА РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ У АНГЛІІ

ЛЕНДАН, 30 (Белта). Становішча рабочай моладзі ў Англіі пагаршаецца з кожным годам. Паводле даных міністэрства працы, з 2-х з паловай мільёнаў маладых рабочых застрахована толькі мільён. Лік беспрацоўных сярод моладзі налічваецца ў 100 тыс. Скуды не ўвасходзіць маса застрахаваных беспрацоўных, а таксама 500 тыс. юнакоў і дзяўчат, пазбаўленых дапамог у результаце «праверкі патрабоўнасьці». Прадпрыемцы ўзмоцнена эвальюцыюць 16-гадовых рабочых, замяняючы іх 13-14-гадовымі.

У Англіі яшчэ мае моц закон 1886 году, які дазваляе наём рабочай сілы на ўзросьце ад 12 год. Нават ў галінах прамысловасьці, на якія распаўсюджваецца законы аб працы, юнакі і дзяўчаты ад 14 да 18 год працуюць па 74 гадзіны ў тыдзень. У астатніх галінах рабочы тыдзень даходзіць да 90 гадзін. У машына-будаўнічай прамысловасьці, дзе шостая частка рабочай сілы складаецца з моладзі, стараюцца наймаць перавазна даўчат, якія ня маюць доступу ў прафсаюз і часта атрымоўваюць 7 руб. у тыдзень. У вугольнай прамысловасьці, дзе занята звыш 70 тыс. моладзі рабочых, узровень зарплаты (напрыклад у Шатляндыі) ніжэй, чым быў сто год назад.

У Клейкросе адзначаен выпадак, калі 17-гадовы гарнчк апошнія 22 тыдні атрымліваў тыднёвую зарплату ў 20 кап. Вялізарная маса моладзі працуе ў якасьці разносчыкаў, рассыльных і г. д., атрымліваючы ўжо, як правіла 2-3 руб. у тыдзень. Для фізычнага стану рабочай моладзі паказальна, што ў 1929 годзе ваенна-праверачныя камісіі забракавалі 51 проц., а ў 1932 г. — ужо 59.

Бязьлітасная эксплёатацыя рабочай моладзі ва Францыі

ПАРЫЖ, 30 (Белта). Эканамічны крызіс, які выклікаў масавае беспрацоўе, асабліва моцна адбіўся на становішчы юнацкага пралетарыяту ва Францыі, які да крызісу налічваў 1.495 тыс. рабочых да 20 год і 875 тыс. работніц. Працоўнае заканадаўства, якое забаранае падросткам да 18 год начную работу, сыстэматычна парушаецца прадпрыемцамі. Нават пры доменных печах падросткі працуюць у 3 зьмены да 8 гадзін. У горнай прамысловасьці дэпартамэнту Нор і Па-дэ-Калэ працуе 50 тыс. маладых рабочых да 18 год пры агульнай колькасьці рабочых у гэтых раёнах у 160 тыс. чалавек. Тарыфная стаўка падростка хістаецца ад 14 з паловай франкаў (для 13 гадоў) да 27 франкаў (для 18 гадоў). У дэпартамэнце Гар зарплата 13-гадовых падросткаў толькі 7 франкаў у дзень, у той час, як дарослых рабочых—22 франкі.

У тэкстыльнай прамысловасьці занята 250 тыс. маладых рабочых і ўсе яны атрымліваюць таксама толькі палову стаўкі дарослага рабочага. Зарплата батрацкай моладзі, і без таго нізкая, нядаўна была скарочана яшчэ на 25-30 проц.

Шырокая мюдаўская кампанія камсамолу ПАЗШ

Н'Ю-ЕРК, 31 (Белта). Кампанія камсамолу ў сувязі з міжнародным юнацкім днём абхапіла ня менш 200 прамысловых гарадоў ПАЗШ. Падрыхтоўваюцца дэманстрацыі ў раёнах ваенных заводаў і ваенна-морскіх вэрфаў. Орган камсамолу «ЮНГ УОРКЕР» у спэцыяльным нумары заклікае да барацьбы супроць праграмы «адналўленьня прамысловасьці», супроць падрыхтоўкі вайны і фашызму і за абарону СССР.

У ПАЗШ некалькі мільёнаў маладых рабочых пазбаўлены работы. Моладзь, якая заканчвае тэхнічныя навучальныя установы, ня можа знайсьці работы нават у якасьці чорнарабочых. Сярод моладзі ўзмацняецца цяга да адзінага фронту. У Чыкаго, Клеўлендзе і іншых гарадох групы сацыялістычнага саюзу моладзі прынялі пад кіраўніцтвам камсамолу ўдзел у кампаніі па падрыхтоўцы міжнароднага юнацкага дня наперакор рашэньням сацыял-фашысцкага кіраўніцтва.

УЗБРОЕНАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ СЯЛЯН У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

9 удзельнікам выступленьня пагражае кара сьмерцю

ВАРШАВА, 30 (Белта). Газэты паведамляюць аб адданьні палявому суду 8 сялян і жыхарэй гораду Пінску КАПЛАН за ўдзел ва ЗБРОЕНЫМ ВЫСТУПЛЕНЬНІ Ў РАЁНЕ БРЭСТУ. Такім чынам, пацьвярджаецца ўпарта цыркулёўваўшыя чуткі, што ў пачатку жніўня пад Брэстам адбыліся буйныя узброеныя выступленьні сялян супроць паліцыі, прадпрынятыя затым ваеннымі часьцямі. Як паведамляе абвінавачэньне акт, у ч з 3 на 4 жніўня сяляне арганізавалі дэманстрацыю, у [illegible] разбройці [illegible] і ў раёне [illegible] Новасёлки, [illegible] Лобраніцкі пост. Затым завязалася перастрэлка, якая цягнулася каля гадзіны. Усім падсудным пагражае кара сьмерцю.

Як паведамляе «РОБОТНІК», ПА ЎСЁЙ ПОЛЬШЧЫ Ў ШМАТ ЯКІХ ВЁСКАХ У ПАМЯЦЬ ЗАГІНУЎШЫХ У ЧАСЕ СЯЛЯНСКІХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ У КРАКАЎСКІМ І ЛЬВОЎСКІМ ВАЯВОДЗТВАХ АДБЫЛІСЯ ЖАЛОБНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ. У НОЦКАВЕ, Робчыцкага павету, загінулі ў баёх з паліцыяй 9 сялян, на гледачы не зьяўленыя вёсцы [illegible] і [illegible] ранены аўтамабілю, адбылася шматлюдная дэманстрацыя.

ВОБЫСКІ І АРЫШТЫ У РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

БЭРЛІН, 30. (Белта). Як паведамляе агенцтва «Конці», паліцыі нібыта ўдалося ўстанавіць, што арганізацыя МОПР па-ранейшаму працуе па ўсёй Рурской вобласьці. У сувязі з гэтым у апошні дні былі праведзены масавыя вобыскі ў 35 розных месцах. Праведзена шмат арыштаў і канфіскавана камуністычная літаратура. Усе арыштаваныя будуць аддаены пад суд па абвінавачаньні ў «дзяржаўнай здрадзе».

Арганізацыю МОПР у Рурской вобласьці нібыта ўзначальвалі камуністычныя актывісты —ГЕФКЕ, якая выконвала функцыі казначэя арганізацыі, і САРЫЦКІ. У МЮНСТЭРЫ арыштавана 26 чалавек па падазрэньні ў тым, што яны стварылі падпольную камуністычную арганізацыю. У ЭРФУРЦЕ выкрыта «нелегальнае бюро акруговай камуністычнай арганізацыі». Арыштавана трое.

Новая забарона распаўсюджваньня замежных газэт

БЭРЛІН, 30 (Белта). Як паведамляе «Бэрлінэр бэрзэн кур'ер», эноў забаронена распаўсюджваньне ў Германіі наступных замежных газэт і бюлетэняў: «МОСКАЎЭР РУНДШАЎ», бюлетэнь «АНТЫФАШЫСЦКІ ФРОНТ», «БАЛТЫШЭ НЭІЕ ПРЭСЭ», аўстрыйская газэта «ІНСБРУКЕР ЦЭЙТУНГ», пражская «АБЦ», «СВАРЛЕНТЫШЭ ГЭВЭРКШАФТСЦЭЙТУНГ», парыская «ФРЭЙХЕЙТ», амстэрдамская «ДЭ ФАКЕЛ», венская «ДЭР СОЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ» і «ПОЛІТЫШЭ БРЫФЭ ДЭР ШВАРЦЭН ФРОНТ», парыская «ЮДЫШЭ ПРЭСЭ ЦЭНТРАЛЕ» і базельская «НАЦЫЯНАЛЬ ЦЭЙТУНГ».

Барацьба за перадзел Цэнтральнай Эўропы

Англія незадаволена зьнешняй палітыкай Германіі

ЛЕНДАН, 30. (Белта). «Морнінг пост» у рэдакцыйным артыкуле дае агляд апошніх ініцыятываў на швэйцарскай, бэльгійскай, дацкай, францускай і аўстрыйскай границах Германіі і заяўляе: «Было-б недарэчна дапускаць, што брытанская грамадская думка не асуджае з поўнай адзінадушшам правакацыйныя мэтады, з дапамогаю якіх нацыянал-сацыялісты разьлічваюць правесьці ў жыцьцё свае зьнешня-палітычныя ідэі. Калі новыя кіраўнікі Германіі ня зьменяць сваіх мэтадаў, дык яны хутка пераканаюцца, што іх бацькаўшчына ізалявана больш чым калі-небудзь з часу сусьветнай вайны». Есьць таксама адзнакі вострага нездавальненьня з поваду калёніяльных імкненьняў нацыянал-сацыялістаў і ў прыватнасьці нацыянал-сацыялісцкай агітацыі за зварот Германіі яе былой калёніі ў Афрыцы — Танганайкі.

Відны кансэрватыўны дэпутат сэр Джон Сэндэрсон Ален, выступаючы на пасяджэньні Палаты, палічыў патрэбным падкрэсьліць, што Танганайка астанецца часткаю Брытанскай імперыі і што гэта палажэньне не надлягае ніякім зьменам.

Рэпрэсіі супроць нацыянал-сацыялістаў у Аўстрыі

ВЕНА, 30. (Белта). Суд прысяжных у Ніжняй Аўстрыі прыгаварыў кіраўніка аднаго з аўстрыйскіх нацыянал-сацыялісцкіх штурмавых атрадаў у Мозэля да 12 год катаржных работ за ўдзел у забойстве дапаможнага паліцэйскага; другі штурмавік прысуджаны да 5 год катаржных работ. У Інсбруку трое нацыянал-сацыялістаў, якія займаліся нелегальным вырабам ручных гранат, прысуджаны да аднаго году зьняволеньня ў турме кожны. З Інсбруку паведамляюць аб новым выпадку захопу члена аўстрыйскага хэймвэру, які ўваходзіць у склад дапаможнай паліцыі. Захоплены быў адпраўлен нацыянал-сацыялісцкімі штурмавікамі на германскую тэрыторыю.

За дзейнасьць супроць інтарэсаў Аўстрыі пазбаўлены грамадзянства 3 уцёкшыя ў Германію кіраўнікі аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў.

Аўстрыя ўзмацняе ахову тырольскай граніцы

БЭРЛІН, 30. (Белта). Германскі друк распаўсюджвае паведамленьні аб маючым быць нібыта ўзмацненьні ваенных гарнізонаў у Тыролі. Газэты сьцьвярджаюць, што ў тырольскую мясцовасьць Сант-Іоган (на Баварскай граніцы) прыбыў батальён з Бены. У бліжэйшы час нібыта будзе таксама ўмацован гарнізон у Куфштэйне і ў радзе іншых пагранічных гарадоў і будуць арганізаваны новыя атрады дапаможнай паліцыі з мэтай ўзмацненьня аховы тырольскай граніцы.

Дэкрэт Рузвэльта аб вывазе золата

НЮ-ЁРК, 30. (БЕЛТА). Рузвэльт выдаў дэкрэт, які ўносіць зьмены ў пастанову аб забароне вывазу золата. Дэкрэт дазваляе вывад золата новай адабычы праз пасярэдніцтва міністэрства фінансаў. Дэкрэт выклікан націскам ўладальнікаў залатых рудзікоў. З часу адмаўленьня ПАЗШ ад залатога стандарту яны вымушаны былі прадаваць свае золата ўраду па цьвёрдай цане ў 20 даляраў 60 цэнтаў за ўнцыю, у той час, як сусьветныя цэны выражаюцца, прыкладна, у 30 даляраў за унцыю. Многія ўласьнікі абыходзілі забарону і вывозілі золата нелегальна. Нядаўна па пастанове міністэрства фінансаў было дазволена вывозіць золата ў рудзе. Аднак, гэта пастанова выклікала пратэсты золатапрамысловцаў. Апошні-ж дэкрэт дазваляе вывад новаздабытага золата праз пасярэдніцтва міністэрства фінансаў ва ўсіх відах, у тым ліку і ў апрацаваным.

Некаторыя назіральнікі лічаць, што новы дэкрэт, павялічваючы абарот міністэрства фінансаў у золаце, тым самым забясьпечыць яму фонд, з дапамогаю якога яно зможа рэгуляваць курс даляра. Характэрна, што Рузвэльт таксама выдаў дэкрэт, які дазваляе набываць золата для заграніччных апэрацый.

* * *

ЛЕНДАН, 30. (БЕЛТА). Новы дэкрэт Рузвэльта па пытаньні аб вывазе золата тлумачыцца як адзнака таго, што ПАЗШ намераны ў бліжэйшы час прыступіць да шырокай інфляцыі.

Баявое наступленьне кітайскай Чырвонай арміі ў правінцыі Фуцзян

ТОКІЁ, 30 (Белта). У сувязі з насту[illegible] кітайскай Чырвонай арміі ў правінцыі ФУЦЗЯН і ўзвышанай пагрозы занятасьці часьцямі Чырвонай арміі галоўнага гораду правінцыі ФУЧЖОУ, 29 жніўня ў Фучжоу прыбілі пад прадлогам «абароны апошніх рэзыдэнтаў» японскі крэйсэр і 2 контрмінаносцы. У Фучжоу таксама [illegible] англыскі і амэрыканскі контрмінаносцы. Згодна атрыманых вестак, улады Фучжоу, апасаючыся занятасьці гораду часьцямі Чырвонай арміі, 28 жніўня прыступілі да эвакуацыі ўрадавых архіваў з гораду.

Замежная хроніка

* У сувязі з міжнародным зьездам гісторыкаў, у Варшаве адкрылася выстаўка савецкай гістарычнай кнігі. Выстаўка, на якой экспанавалі да тысячы назваў гістарычных выданьняў, вы пашчых за апошнія гады ў СССР, карыстаецца вялікім посьпехам.

* Міністар зямляробства ПАЗШ — Услец абвясьціў, што ўрад намераны прэміяваць фэрмэраў, які абавязваюцца скараціць у будучым годзе пасеўную плошчу пад пшаніцаю на 15 проц. Калі ўсе фэрмэры прымуць прапанову ўраду, дык пасеўная плошча пад пшаніцай скарацціца на 4 мільёны га.

* Па просьбе японскага консула ў Фучжоу (правінцыя Фуцзянь) морскія ўлады адправілі ў порт Мавэй каля Фучжоу крэйсэр і 2 эсьмінчыкі.

* Мытная палітыка ангельскага ўраду, разьлічаная на павышэньне цэн і аднагалосна ўхваленая апошнім зьездам лейбарыстскай партыі, выклікала ў апошнія тыдні падвышэньне цэн на некаторыя харчовыя прышасы.

* Апублікаваны афіцыяльныя весткі аб ліку беспрацоўных у Гішпаніі. Паводле гэтых далёка няпоўных даных, налічваецца 545 тыс. беспрацоўных, фактычна-ж іх прынамсі ў два разы больш.

* Польскі генэральны консул п. Ялавецкі выехаў у водпуск заграніцу. У часе водпуску яго замяняе сакратар польскай місіі ў Маскве п. Калускі.

Аб ходзе дарожнага будаўніцтва з працоўным удзелам насельніцтва

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Улічваючы выключна нездавальняючы ход дарожнага будаўніцтва з працоўным удзелам насельніцтва, абавязаць РК КП(б)Б і РВК з 1-га па 20-е верасьня правесьці двухдэкадзнік скапчэньня дарбудаўніцтва па мясцовых дарогах.

2. Ускласьці на сакратара РК і старшыню РВК пэрсанальную адказнасьць за поўнае скарыстаньне на раёне працудзелу, згодна зацьверджаных плянаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на скапчэньне будаўніцтва і рамонту пад'язных шляхоў, забясьпечваючых магчымасьць нармальных перавозак прадуктаў сельскай гаспадаркі (збожжа, бульба) да станцый чытунак і прыстаняй.

3. Абавязаць т. Фрумкіна аказаць раёнам тэхнічную дапамогу, накіраваўшы з вучасткаў інжынэрна-тэхнічных работнікаў для тэхнічнага кіраўніцтва будаўніцтвам дарог у раёнах.

Сакратар ЦК КП(б)Б
В. ШАРАНГОВІЧ.

СУД

Справа аб масавым захворваньні рабочых на Цнянскіх торфараспрацоўках

Учора ў клюбе Мэдсанпрацы пачаўся паказальны працэс па справе масавага захворваньня рабочых на Цнянскіх торфараспрацоўках.

Справа слухаецца ў складзе суда: старшыні т. Абрамава, членаў т. т. Запатаровай і Бертман. Дзяржаўны абвінаваўча тав. Курачкін. На суд'е таксама прысутнічаюць тры экспэрты і два абаронцы.

На лаве падсудных шэсьць асоб: Клісноскі, [illegible] гарадрацаўдзелу, якія абвінавачваецца ў тым, што даведаўшы ся аб масавым захворваньні рабочых на торфараспрацоўках, ня прыняў экстрэмных мер па аказаньні хворым мэддапамогі.

Праз суткі, калі прыехаў на торфараспрацоўкі Клісноскі, масавае захворваньне рабочых яшчэ ня спынілася. Ён ня прыдаў гэтаму моманту ніякай сур'ёзнасьці, бегла абышоў баракі і спакойна паехаў у Менск.

Праз два дні, калі на торфараспрацоўках захворваньні рабочых прынялі яшчэ большыя разьмеры, Клісноскі, выехаўшы туды з брыгадай дактароў, таксама праяўляў нерашучасьць у справе хуткай дапамогі хворым.

Другі абвінавачаны—доктар Мышкоўская. Яна, як загадчык мэдыцынскага пункту Менскай электрастанцыі, якая абслугоўвае Цнянскія торфараспрацоўкі, зусім ня цікавілася санітарным становішчам бараж'яў, дзе жылі рабочыя, а таксама кухні і сталовай. Выехаўшы з вялікім спазьненьнем на месца захворваньня рабочых, яна фармальна, па-бюракратычнаму адносілася да хворых, не надала масаваму захворваньню ніякага сур'ёзнага значэньня. Больш таго, яна абвінавачвала хворых у сымуляньні, чым дэмаралізавала трыкутнік торфараспрацовак.

Трэці абвінавачаны Каханоўскі — зам. дырэктара торфараспрацовак па рабочым снабжэньні, будучы непасрэдна адказным за санітарнае становішча, ніякай увагі на гэты бок справы не зьвяртаў.

Тое-ж самае трэба сказаць і аб дырэктары торфараспрацовак Саньнікава, які таксама абвінавачваецца ў тым, што бу дучы дырэктарам, бюракратычна адносіўся да запатрабаваньняў рабочых. На ўсе скаргі аб дрэнным санітарным становішчы ў бараках, кухні і сталовай ён не зьвяртаў ніякай увагі, лічачы, што гэта справа яго не датычыцца.

Доктар Файнбэрг і Гінзбург абвінавачваюцца ў тым, што, будучы выдуманымі для аказаньня мэддапамогі хворым, адносіліся да выкананьня гэтых заданьняў бяздушна фармальна. Абышоўшы бегла баракі і не знайшоўшы «нічога сур'ёзнага», яны хутка зьвярнуліся назад.

Пасьля зачытаньня абвінавачэньня заключэньня суд перайшоў да допыту падсудных.

АБ РЭФОРМЕ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ

Гутарка з першым віце-прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук тав. Т. Домбалем

СНК БССР апублікаваў дэкрэт аб зьменах і спрашчэньні беларускага правапісу. Гэты важнейшы палітычны дакумант мае вялікае значэньне для далейшага разьвіцьця і роськвіту беларускай пралетарскай культуры і мовы.

Пытаньне рэформы правапісу ні ў якім разе не зьяўляецца «вузка-акадэмічным» пытаньнем. Гэта праблема сугуба палітычная, цесна зьвязаная з клясавай барацьбой.

Ня трэба забываць, што беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, выходзячы з сваіх буржуазна-рэстаўратарскіх мэт у барацьбе з кампартыяй і савецкай уладай, праводзіў падрыўную, шкодніцкую работу як на гаспадарчым, так і на культурным фронце, у тым ліку і ў галіне беларускай мовы.

Чым зьяўляецца мова, на гэта пытаньне мы маем выразныя ўказаньні МАРКСА, ЭНГЕЛЬСА, ЛЕНІНА і СТАЛІНА. Маркс кажа: «Мова гэта практычна існуючая для іншых людзей, а значыць існуючая для мяне самога рэальная сьвядомасьць». Ленін указвае: «Гісторыя думкі — гэта гісторыя мовы» і называе мову магутнейшым сродкам сувязі паміж людзьмі. Асабліва ярка падкрэсьлівае тав. Сталін ролю нацыянальных моў у пэрыяд дыктатуры пралетарыяту, разьвіцьцё якіх дае магчымасьць «па-сапраўднаму ўцягнуць адсталыя нацыянальнасьці ў справу сацыялістычнага будаўніцтва».

Не выпадкова, што ў барацьбе супроць кампартыі і савецкай улады беларуская контр-рэвалюцыя імкнулася ахапіць сваім уплывам працоўныя масы, вуснамі махровага контр-рэвалюцыянэра ЛЕСІКА, аўтара нацыянал-дэмакратычнай беларускай граматыкі ў 1926 годзе заяўляла: «Для нас мова становіць усё: нашу палітыку, эканоміку і наш грамадзкі ўклад жыцьця» і што «... мова вызваліць нас з нядолі».

Беларускі нацыянал-дэмакратызм на справе праводзіў шкодніцкую работу ў галіне мовы, выходзячы з наступных асноў:

з увядзеньня ў сучасную беларускую мову сярэднявяковых споў, архаізмаў з «літоўскай мэтрыкі» і старыннага споўніка Берында і інш.;

з утварэньня новых споў на прынцыпах пурызму, захаваньня «самабытнай» чыстаты беларускай мовы і рашучага выкананьня з мовы элемэнтаў інтэрнацыяналізму;

з адрыву мовы ад жыцьця, гаворак пралетарыяту і бядняцка-серадняцкага сялянства;

з недапушчэньня ў беларускую мову саватызмаў і рашучай барацьбы з уплывам пралетарыяту на разьвіцьцё мовы;

з стварэньня штучнага бар'еру паміж беларускай і рускай мовамі, арыентуючыся на буржуазны Захад, рашучага выкананьня з беларускай мовы рускіх элемэнтаў;

з грубой полянізацыі беларускай мовы;

з увядзеньня ў беларускую мову пошлых буржуазных вульгарызмаў.

Тую-ж клясава-варожую пралетарыяту пінію ў галіне беларускай мовы праводзяць да гэтага часу беларускія нацыянал-фашысты ў Заходняй Беларусі на чале з вядомымі палёнізатарамі, агентэмі польскага фашызму — накшталт абскуранта Янкі Станкевіча, Луцкевіча, Астроўскіх, Акінчыцаў і інш., якія аблываюць памылкі першага беларускага граматыка-лінгвіста акадэміка Тарашкевіча — вязьня польскага фашызму за «маскалізмы» ў яго граматыцы.

На так званай акадэмічнай канфэрэнцыі ў 1926 годзе абнаглеўшыя нацдэмы, вуснамі авантурыста «міністра бутафорскай Беларускай «Народнай Рэспублікі» Ластоўскага заяўлялі: «Наша старая самабытная мова, дзякуючы сучаснай граматыцы і правапісу, якія ў каранёх пакінулі рускі правапіс, зьяўляецца правінцыяльным дыялектам рускай мовы».

Выходзячы з гэтай праграмнай контрэвалюцыйнай устаноўкі нацыянал-дэмакраты і рабілі штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовамі.

У адносіне беларускай мовы, паміж іншым, мы тут павінны правесьці вельмі каштоўнае выказваньне ЭНГЕЛЬСА, важнасьць якога падкрэсьлівае ЛЕНІН (ЗБОР ТВОРАЎ, ТОМ XIX, III ВЫД., СТ. 258). Энгельс пісаў: «к поўдню ад літоўцаў, на ўсход ад цяперашняга кордону ўсходняга былі беларусы, якія гаварылі на мове паміж польскай і рускай, але бліжэй да апошняй».

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, разграміўшы беларускі нацыянал-дэмакратызм, ачысьціўшай ад нацдэмаў Беларускую акадэмію навук новае кіраўніцтва БелАН на чале з акадэмікам тав. ГОРЫНЫМ разгарнула шырокую навукова-дасьледчую работу ва ўсіх галінах навукі, у тым ліку і ў галіне мовазнаўства. Інстытутам мовазнаўства Беларускай акадэміі навук праароблена за апошнія два гады вялікая работа як у галіне споўніка-тэрміналёгічнай, так і па рэформе беларускага правапісу. Праект, выпрацаваны інстытутам, быў пакладзен у аснову апублікаванага дэкрэту СНК БССР аб зьменах і спрашчэньні беларускага правапісу.

Ва ўсёй гэтай рабоце надзвычай вялікую дапамогу аказалі Акадэміі спэцыяльная камісія, нарады пры Наркамасьвеце БССР, пісьменьніцкія арганізацыі і пралетарская грамадзкасьць БССР.

У аснову рэформы правапісу пакладзена марксыцка-ленінскае адзінства фанэтычнага і этымалёгічнага прынцыпаў. Зьмены і спрашчэньне беларускага правапісу праведзены ў мэтах выкананьня з беларускага правапісу нацыянал-дэмакратычных скажэньняў, у мэтах аблягчэньня шырокім працоўным масам вывучэньня беларускай пісьменнасьці, у мэтах вызваленьня школы ад непрадукцыйнай работы пры вывучэньні беларускага правапісу, у мэтах далейшага разьвіцьця культуры беларускай мовы і поўнага падпраддаваньня беларускага правапісу задачам выхаваньня працоўных мас у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Неабходна адзначыць, што патрабуецца яшчэ далейшая работа ў гэтым напрамку. Вось чаму СНК БССР і даручыў Наркамасьветы, а таксама і прэзыдыуму Беларускай акадэміі навук арганізаваць сыстэматычную навуковую работу па далейшым разьвіцьці і ўпарадкаваньні беларускага правапісу, усёй граматыкі і тэрміналёгіі. Таксама арганізаваць новае выданьне беларуска-рускіх споўнікаў, вытраўляючы з беларускай мовы ўсякія буржуазна-нацыяналістычныя тэорыі і скажэньні.

У заключэньне трэба адзначыць, што пры распрацоўцы пытаньняў правапісу былі ўлічаны вялізарнейшыя культурныя дасягненьні працоўных мас БССР у выніку ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, усё больш растучая інтэрнацыянальная сувязь працоўных Саюзу ССР і працэсы скрыжаваньня моў.

Пры распрацоўцы рэформы правапісу Інстытут мовазнаўства цьвёрда памятаў словы правадыра пралетыяту т. Сталіна аб барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, які (шавінізм) імкнецца «абыйсьці нацыянальныя асаблівасьці мовы, культуры і быту».

Рэформа беларускага правапісу сапраўды зьяўляецца буйным крокам наперад у справе будаўніцтва беларускай культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па сваім зьмесьце.

(БЕЛТА).

Чырвоная кніга ўдарнікаў фінфронту

Калегія Наркамфіну БССР і ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў пастанавілі арганізаваць Усебеларускую чырвоную кнігу. У кнігу будуць заносіцца лепшыя ўдарнікі фінфронту, кіраўнікі і пасобныя работнікі фінансавай сыстэмы, паказаўшыя прыклады бальшавіцкай барацьбы за выкананьне фінансавага пляну і дасягнуўшыя значнага павышэньня якасьці работы фінансавых органаў.

Кандыдаты для занясеньня ў чырвоную кнігу выпучаюцца гарфа, райфа і РМК саюзу ФБР і зацьвярджаюцца партыйнымі камітэтамі, гарсаветамі і РВК. Само занясеньне будзе праводзіцца пастановай Калегіі НКФ БССР і ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў. Акрамя таго, усе ўдарнікі фінфронту [illegible] будуць занесены ў чырвоную кнігу, будуць прэміявацца. Для прэміяваньня выпучан фонд у суме 10.000 рублёў.

Разам з гэтым калегія НКФ і ЦП саюзу абязвазалі сэктар масавай работы і мабілізацыі сродкаў устанавіць спэцыяльны ўлік ударнікаў, занесеных у чырвоную кнігу, забясьпечыць ім дапамогу ў асваеньні тэхнічных фінансавых ведаў і павышэньні палітычнага ўзроўню, а сэктар кадраў НКФ забясьпечыць ім магчымасьць па-за чаргавага паступленьня ў фінансавыя установы, з абавязковым забясьпячэньнем стыпэндыямі.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖЦЫРК
Гарадзкі сад
пачатак у 8 с пал. газэ. веч.
НОВАЯ ГРАНДЫЁЗНАЯ ПРАГРАМА
КОНКУРС АРТЫСТАЎ
Новыя атракцыёны-нумары
МОРСКІЯ ЛЬВЫ—Роз—Ласка
Монтано—амэрыканск.—індыйск. каўбы.
Ло і Рико—арыгінальн. акрабаты—парадысты.
Музычн. сатырыкі Вас Бэйс злобя дня
Оліано—эквілібрысты. Лоо Амбатос—паветраны палёт і яшчэ шмат іншых нумароў новага жанру

ГУНАВЫ кіно-тэатр „Чырвоная Зорка“ — Мастацкі гістарычны фільм ДЗЬВЕ КАРАЛЕВЫ (Дароты Вернон) (Трагэдыя ў 10 частках).
Кіно Інтэрнацыянал — Замежны мастацкі фільм ВОЧЫ МЕРЦЬВЯКА Драма ў 6 частках
Кіно „Пралетары“ — Замежны мастацкі фільм „ВАНІНА“ драма ў 6 частках
КІНО СПАРТАК — Замежны мастацкі фільм „ЖОНА СТАТС-САКРАТАРА“
Дзіцячы гунавы кіно-тэатр — прыгодніцкі кіно-фільм Дзіця дзяржцырку УБ ЧАСТКАХ. Пачатак а 2 гадз. дня

Завочны сэктар Магілеўскага пэдінстытуту
абвяшчае асеньні НАБОР
на аддзяленьні сацыяльна-гістарычнае, літаратурна-лінгвістычнае і прыродазнаўчае.
На сацыгістарычным і літаратурна-лінгвістычным аддзяленьні адкрываецца рускі сэктар. Прымаюцца асобы, меючыя сярэднюю адукацыю: рабочыя, калгаснікі, служачыя без адрыву ад вытворчасьці.
Прыём заяў да 1 кастрычніка 1933 г. па адрасе: г. Магілеў, БССР, Ленінская вул., № 35, пэдінстытут, завочны сэктар.
Прыёмныя іспыты да 1 верасьня. Да заяў прыкладзіць дакументы: даведку аб асьвеце, аб сацыяльным паходжаньні і асобны лісток.

ІНСТЫТУТУ БАЛОТНАЙ ГАСПАДАРКІ
ПАТРАБУЮЦЦА
ГАЛОЎБУХ, або БУХГАЛЬТАР.
Зварочвацца: Шырокая, 28.

Правер свае білеты 3-й усесаюзнай лётарэі Аўтадору
І атрымай выйгрышы па 19 разраду 3-й аўталётарэі, якія палі па БССР і да гэтага часу не атрыманы.
Аўтамабілі—4, матацыклаў—6 вэлёсыпэдаў—84 і шмат іншых рэчаў.
Таблічы выйгрышаў ё сьць у кожным гарадзкім і раённым савеце Аўтадору.
Выйгрышы выплачваюцца пунктамі, указанымі на адваротным баку білета. Тэрмін аплаты працягнут.
ЦС АЎТАДОРУ БССР.

Цэнтральны Савет Аўтадору БССР
даводзіць да ведама ўсе райсаветы, ячэйкі і калектывы Аўтадору, што з 15 жніўня па 15 лістапада 1933 г.
ПРАЦЯГВАЕЦЦА РЭАЛІЗАЦЫЯ 4-й АУТАЛЁТАРЭІ.
Білеты для рэалізацыі выдаюцца ад паведамні гарадзкіх і раённых саветаў Аўтадору, упаўнаважанымі ад калектываў і ячэек Аўтадору.
Менскі гарсавет Аўтадору выдае білеты штодзённа, ад 10 гадз. ран. да 9 гадз. веч. у памяш. па Савецкай, 62, пакой 2.
ЦС АЎТАДОРУ БССР

ГЕАДЭЗЫЧНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЫЛОГА ВОДНА-МЭЛІЯРАЦЫЙНАГА ІНСТЫТУТУ,
якое згодна пастановы СНК БССР ад 15 жніўня г. г. заставецца ў Горках у складзе факультэту арганізацыі гэрыторыі і геадэзіі Беларускага с. г. інстытуту,
АБВЯШЧАЕ
набор студэнтаў на 1 курс
Геадэзычнае аддзяленьне рыхтуе інжынэраў-геадэзістаў шырокага профілю для выкананьня і арганізацыі вясьнуючых геадэзычных работ, сацыяльных тапаграфічных здымкаў і здымкаў гарадоў.
Прыём заяў на геадэзычнае аддзяленьне да 10 верасьня г. г. Усе асобы падаўшыя заявы, незалежна ад скончэньня сярэдняй школы (рабфак, тэхнікум, 9-годка) павінны трымаць іспыты з 10 верасьня па 15 верасьня г. г. Прынятыя студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Дакументы высылаюцца па адрасе: Беларускія Горкі, с.-г. інстытут, геадэзычнае аддзяленьне.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Марына-Горскі садова-гародны тэхнікум,
які рыхтуе агранома ў галовай і гароднінай сярэдняй кваліфікацыі, абвяшчае
дадатковы НАБОР студэнтаў
ў ліку 30 асоб на вячэрняе гародняе аддзяленьне без адрыву ад вытворчасьці. Таксама працягваецца прыём заяў на і курс дзённага пладовага і гароднінай аддзяленьня на дадатковыя групы. Прымаюцца асобы з ведамі ў аб'ёме сямігодкі. Да заяў неабходна прыкласьці наступныя дакументы: зазь ведчаную анкету, пасьведчаньне аб асьвеце, аб сац. матар'яльн. становішчы, аб узросьце, аб стане здароўя. Прыём заяў і іспыты да 10 верасьня. Пачатак заняткаў для дадатковых груп з 10 верасьня. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, сталоўкай і інтэрнатам. Адрас: пашт. аддз. Марына-Горка, садова гародны тэхнікум,
ДЫРЭКЦЫЯ.

ВЫШЭЙШАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ШКОЛА Беларусі імя Леніна
—ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО—
прыём дакумантаў,
а таксама іспыты праводзяцца да 3 верасьня г. г.
Усе т. т., дапушчаныя мандатнай камісіяй да іспытаў і атрымаўшыя паведамленьне аб яўцы, павінны зьявіцца на іспыты не позьней 3 верасьня.
Райкомы і Гаркомы КП(б)Б, якія ня выкавалі разьвёрсткі па адбору кандыдатур у ВКСГШБ, павінны неадкладна адабраць кандыдатуры і ўсе дакументы іх накіраваць у ВКСГШБ да 1 верасьня.
Дапушчаных да іспытаў, а таксама залічаных у ВКСГШБ, Райкомы і Гаркомы не павінны затрымліваць.
Мандатная камісія.

ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР
ПАТРАБУЮЦЦА
НА СТАЛУЮ ПРАЦУ
машыністкі.
Зварочвацца: